№ 8 (510) 9 сакавіка 2007

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

# Шаленства на рынку нерухомасьці

У сталіцы ўсталяваліся рэкордна высокія цэны на жытло. Спэцыяльны рэпартаж **Тацяны Сьнітко**.

Сярэдні кошт квадратнага мэтра ў аднапакаёўцы пераскочыў за $1500. Гэтая гонка, калі за тыдзень кватэра даражэе на 2—3 тысячы, нэрвуе ўдзельнікаў рынку ўжо другі месяц. Жыльлёвы рынак сярод першых адрэагаваў на рост цэнаў на энэрганосьбіты. Чуткі пра магчымы абвал беларускай валюты прывялі да таго, што прапанаваньне пачало значна адставаць ад попыту. Аднак прыпыненьне шэрагам банкаў выдачы крэдытаў у рублях выклікае прагнозы пра магчымае падзеньне цэнаў на жытло праз зьмяншэньне колькасьці рэальных пакупнікоў. **Старонка 4.**

## У НУМАРЫ

**Кангрэс адкладзены да лепшых часоў**

Мілінкевіч і партыйныя лідэры ідуць на «кампраміс дзеля адзінства». **Старонка 3.**

**Сухарэнка памыліўся**

Сакавік будзе значна цяплейшы, чым звыкла. **Старонка 3.**

**Антырэвалюцыйны спэктакль паводле Караткевіча**

У Тэатры Беларускай арміі, у драматургіі Дударава. Піша Антон Тарас. **Старонка 9.**

**Фальсыфікацыя маралі, або Купала па-гарадзенску**

У Гарадзенскім тэатры паставілі «Раскіданае гняздо»... Піша Андрэй Павач. **Старонка 10.**

**Дэжавю**

Санкт-Пецярбург у суботу нагадаў Менск узору 1997 году. Піша Віталь Тарас. **Старонка 8.**

**Калыханкі Зьмітра Вайцюшкевіча**

можна паставіць у шэраг адвечных разам з «Народным альбомам». **Старонка 14.**

# Кляштар з прэзыдэнцкім люксам




Яшчэ адзін квартал старога Менску заменяць муляжом. У рукі карэспандэнта «НН» трапіў таемны праект перабудовы кляштару бэрнардынаў. Піша Сяргей Харэўскі. **Старонка 6.**

## У НУМАРЫ


### люстра дзён
Шаленства на рынку нерухомасьці .. 4
Кляштар з прэзыдэнцкім люксам ...... 6
Хроніка ........ 12

### камэнтары
Віталь Тарас. Дэжавю ........ 8
Андрэй Павач. Фальсыфікацыя маралі, або Купала па-гарадзенску 12
Павал Севярынец. Злачынства і пакаяньне ........ 16
Ян Максімюк. Лукашэнку чакае змрочная будучыня ........ 19

### культура
Антырэвалюцыйны спэктакль паводле Караткевіча ........ 10

### дыскаграфія
Зьміцер Вайцюшкевіч, Песенькі самотнага ліцьвіна і Пара рублёў ... 14

### вольны час
«Індыга», «ARCHE», глямур, тры расейскія літары, тэатры... ........ 30

### калі б...
...бальшавік Фрунзэ ведаў, што створаная ім беларуская міліцыя будзе праз 90 гадоў перасьледаваць камуністаў. ........ 31







# Дзень Волі мусіць стаць нацыянальным сьвятам

## Зварот дзеячаў грамадзтва і культуры да Савету Міністраў

Беларусь перажывае пераломны этап свайго разьвіцьця. Сёлета спаўняецца 16 гадоў аднаўленьня яе дзяржаўнай незалежнасьці. Аднак на парозе паўналецьця Рэспублікі Беларусь нацыя застаецца расколатай. Мільёны суайчыньнікаў паранейшаму не адчуваюць духоўнай сувязі зь беларускай дзяржаўнасьцю. Палітычнае супрацьстаяньне грамадзянаў закладае міну запаволенага дзеяньня пад дзяржаватворчыя высілкі.

Незалежнасьці ня можа быць без трывалай эканамічнай базы. Яе ня будзе, пакуль эканоміка Беларусі будзе залежаць толькі ад усходняга суседа. Захаваньне сувэрэнітэту, устойлівае разьвіцьцё эканомікі будзе гарантаванае толькі тады, калі краіна паўнапраўна вернецца ў сям'ю эўрапейскіх нацый — як роўная між роўнымі. А гэта немагчыма без нацыянальнага адзінства і ўсталяваньня дэмакратычнага дзяржаўнага ладу.

Выклікі сучаснага сьвету — энэргетычныя, дэмаграфічныя, экалягічныя, гуманітарныя — наўпрост тычацца і Беларусі. І даць годны адказ гэтым выклікам можа толькі адзіная нацыя. Дзеля рэальнай ацэнкі сытуацыі і далейшых крокаў па шляху ўмацаваньня дзяржаўнасьці варта прызнаць, што таксама як два вэктары — эўрапейскі і расейскі — абавязковыя для нашага эканамічнага разьвіцьця, так і ўзгадненьне падыходаў улады і апазыцыі неабходнае для разьвіцьця грамадзтва.

Мы павінны спрыяць усталяваньню канструктыўнага дыялёгу паміж уладаю і грамадзянскай супольнасьцю. Важная роля ў сёньняшніх умовах тут можа належаць ураду, які ўсьведамляе неабходнасьць новага этапу разьвіцьця дзяржавы. Менавіта такія дзеяньні ўрадаў уваходзяць у гісторыю як прыклады патрыятызму, дальнабачнасьці і прафэсіяналізму.

Набліжаецца дзень 25 Сакавіка, дарагі для ўсіх патрыётаў Беларусі.

25 сакавіка 1918 года была прынятая Трэцяя Ўстаўная грамата Беларускай Народнай Рэспублікі, якая абвяшчала нашу краіну незалежнай дзяржавай. Пасьля гэтага і Захаду, і Ўсходу стала немагчыма далей ігнараваць дзяржаўныя памкненьні беларускага народу. З таго часу ўсе беларускія патрыёты адзначаюць дзень 25 Сакавіка як найвялікшае нацыянальнае сьвята — Дзень Волі.

У гэты дзень штогод дзясяткі тысяч беларусаў выходзяць на вуліцы гарадоў. Сотні тысяч грамадзян Беларусі і нашых суайчыньнікаў за мяжой адзначаюць гэтую дату. Адсутнасьць яе ў дзяржаўным календары сьвятаў — перажытак савецкага часу.

Абвяшчэньне дня 25 Сакавіка дзяржаўным сьвятам непазьбежнае, бо яно адновіць нацыянальную пераемнасьць. Непазьбежнае і пераадоленьне існуючага ў краіне культурна-гістарычнага расколу беларусаў. Аднак чым пазьней гэта здарыцца, тым слабейшаю будзе Беларусь у гістарычнай пэрспэктыве.

Кіруючыся адказнасьцю за лёс беларускай дзяржаўнасьці, заклікаючы да нацыянальнага яднаньня, мы зьвяртаемся да Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь з прапановай абвясьціць 25 Сакавіка — Дзень Волі — нацыянальным сьвятам. Упэўненыя, што такое рашэньне ўзмоцніць адзінства беларускае нацыі. Будзе справядліва, калі гэта здарыцца ў год 125-годзьдзя клясыкаў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа, якія ўсёй сваёй дзейнасьцю рыхтавалі дзень 25 сакавіка 1918 году і шчыра яго віталі.

Заклікаем таксама кіраўніцтва Савету Міністраў узяць чынны ўдзел у падрыхтоўцы сьвяточных мерапрыемстваў Дня Волі-2007.

Зварот падпісалі некалькі дзясяткаў вядомых дзеячаў навукі, культуры і мастацтва. Сярод падпісантаў — народны паэт Беларусі **Ніл Гілевіч**, былы старшыня Нацыянальнага банку прафэсар **Станіслаў Багданкевіч**, філёзафы **Валянцін Акудовіч**, **Алесь Анціпенка** і **Валер Булгакаў**, ганаровы старшыня Беларускага ПЭН-цэнтру **Лявон Баршчэўскі**, паэты **Генадзь Бураўкін**, **Анатоль Вярцінскі**, **Сяргей Законьнікаў**, **Уладзімер Някляеў**, **Андрэй Хадановіч**, рэжысэр **Валеры Мазынскі**, кінакрытык **Максім Жбанкоў**, мастацтвазнаўца **Сяргей Харэўскі**, мастак **Артур Клінаў**, палітоляг **Віталь Сіліцкі** ды іншыя.

# Кангрэс адкладзены да лепшых часоў

Мілінкевіч і партыйныя лідэры пайшлі на «кампраміс дзеля адзінства».

Аляксандар Мілінкевіч у нядзелю 4 сакавіка накіраваў адкрыты ліст кіраўнікам партыяў і дэмакратычнай грамадзкасьці, у якім згадзіўся на кампраміснае рашэньне ў пытаньні кангрэсу дэмсілаў.

У сваім лісьце Мілінкевіч «прывітаў» прапановы Вінцука Вячоркі па тэрмінах, фармаце і зьмесьце кангрэсу дэмакратычных сілаў, выкладзеныя ў яго звароце ад 16 лютага.

А 5 сакавіка пра згоду на кампраміс заявілі і Анатоль Лябедзька зь Сяргеем Калякіным. Фармат Кангрэсу мусіць вызначыцца на пасяджэньні рады кіраўнікоў палітычных партый 7 сакавіка.

Нагадаем, што Вячорка прапанаваў перанесьці Кангрэс на травень і пашырыць склад яго ўдзельнікаў за кошт дэлегатаў мінулага сходу.

Каб стаць удзельнікамі Кангрэсу па цяперашняй формуле, трэба было назьбіраць 300 подпісаў выбарцаў. У выніку найбольшую дэлегацыю сфармавалі дысцыплінаваныя сябры Партыі камуністаў, але на кангрэсе амаль не прадстаўленыя былі б непартыйныя структуры і інтэлігенцыя — асноўная база Мілінкевіча.

Перанос Кангрэсу можна разглядаць як невялікую тактычную перамогу Мілінкевіча.

**Зьміцер Панкавец**


WWW.SVABODA.ORG
**Па візыце ў Вашынгтон лідэры апазыцыі знайшлі кампраміс.**

# Сухарэнка памыліўся

Вясна будзе раньняй, сакавік будзе значна цяплейшы, чым звычайна.

Такі прагноз даў Гідрамэтцэнтар. Згодна з доўгатэрміновымі прагнозамі, сярэднямесячная тэмпэратура паветра ў сакавіку будзе на 1,5 градуса вышэйшая за кліматычную норму, якая складае ад мінус трох градусаў на паўночным усходзе да плюс аднаго градуса на паўднёвым захадзе.

Так найчасьцей і бывае ў гады, калі Вялікдзень прыпадае рана. У гэтым годзе хрысьціяне сьвяткаваць будуць Пасху 8 красавіка (і праваслаўныя, і каталікі).

Палітыкі традыцыйна прыглядаюцца да надвор'я на дні масавых акцыяў. У сонечны Дзень Волі 1996 году распачалася магутная Вясна-1996. Летась пасьлявыбарныя пратэсты адбываліся ў незвычайныя для канца сакавіка маразы.

Пару тыдняў таму кіраўнік КДБ Сьцяпан Сухарэнка выказаўся ў тым сэнсе, што вясна будзе халодная — і ў кліматычных, і ў палітычных адносінах. У палове свайго прагнозу ён ужо памыліўся.

**МБ**

# Адрыў ад правадной сеткі

Актывісты зь Берасьця выступілі з ініцыятывай усебеларускага флэшмобу. Яны прапануюць у чацьвер, 15 сакавіка, на Дзень канстытуцыі, прыйсьці ў цэнтры ўліку абанэнтаў і адключыцца ад радыёкропкі.

Шмат хто не падазрае, што да гэтага часу аплачвае радыёкропку разам з кватэрплатай, хоць ёй і не карыстаецца. Пра гэта нагадваюць ініцыятары.

Згодна з правіламі аказаньня паслугаў радыёфікацыі, каб адключыцца ад радыёкропкі, абанэнту досыць пэрсанальна зьвярнуцца з заявай у мясцовую групу ўліку абанэнтаў радыёсеткі. Ініцыятары прыводзяць і адрасы.

**Групы ўліку абанэнтаў радыёсетак**

Берасьце: вул.Куйбышава, 60\1, 1–ы паверх. 8.00—18.00.

Менск: вул.Кірава, 33. 8.00—12.00, 12.45—19.00.

Горадня: вул.Горкага, 85. 8.00—12.30, 13.00—17.00.

Магілёў: зав.Буянова, 22. 8.00—12.00, 13.00—17.00.

Гомель: вул.Пушкіна, 6. 8.00—12.00, 13.00—17—00.

Віцебск: пр.Будаўнікоў, 3Б. 8.00—12.30, 13.00—17.00.

## Эўрасаюз падоўжыў санкцыі супраць высокапастаўленых лукашэнкаўцаў

На нарадзе міністраў замежных справаў ЭС адбылося галасаваньне ў пытаньні захаваньня санкцыяў да Беларусі. Вырашана іх падоўжыць. Санкцыі супраць 34 адказных беларускіх чыноўнікаў на чале з А.Лукашэнкам захаваюцца яшчэ на год.

**Ул.інф.**

## Дзьвесьце запрашэньняў на Дзень Волі

Аляксандар Мілінкевіч даслаў каля двухсот запрашэньняў эўрапейскім палітыкам і грамадзкім дзеячам прыехаць у сталіцу Беларусі на Дзень Волі. Такія запрашэньні накіраваны Леху Валэнсу, Вацлаву Гаўлу, кіраўнікам фракцый Эўрапарлямэнту. Ужо выказаў зацікаўленасьць у прыезьдзе намесьнік старшыні Эўрапарлямэнту.

Прысутнасьць замежнікаў у Менску магла б забясьпечыць большую бясьпеку ўдзельнікам традыцыйнага шэсьця. Лідэры апазыцыі просяць улады дазволіць збор на Кастрычніцкай плошчы, шэсьце да плошчы Перамогі і канцэрт у Цэнтральным дзіцячым парку.

**Ул. інф.**

# Шаленства на рынку нерухомасьці

У сталіцы ўсталяваліся рэкордна высокія кошты на жытло. Спэцыяльны рэпартаж **Тацяны Сьнітко**.

Сярэдні кошт квадратнага мэтру агульнай плошчы ў аднапакаёўцы пераскочыў за 1500 даляраў. Гэтая гонка, калі за тыдзень кватэра лёгка можа падаражэць на 2—3 тысячы у.а., нэрвуе ўдзельнікаў рынку ўжо другі месяц.

Нават рыэлтэры-вэтэраны ня памятаюць гэткага імклівага росту коштаў на жытло. Гэта выглядае абсалютным кантрастам на тле звычайнага студзеньскага зацішша на рынку нерухомасьці.

Менавіта жыльлёвы рынак адным зь першых адрэагаваў на рост цэнаў на энэрганосьбіты. Чуткі пра верагодны абвал беларускай валюты ў новых эканамічных рэаліях прывялі да таго, што прапанова стала значна адставаць ад попыту. Зь іншага боку, прыпыненьне шэрагам банкаў выдачы крэдытаў у беларускіх рублях выклікае прагнозы пра магчымае падзеньне цэнаў на жытло праз рэзкае зьмяншэньне колькасьці рэальных пакупнікоў. Прынамсі, больш за дзьве трэціны кліентаў агенцыяў нерухомасьці набываюць жытло з дапамогай крэдытаў.

Нерухомасьць заўсёды была ня толькі ўвасобленым у канкрэтнае жытло «сваім кутом», дахам над галавой, але і сродкам інвэставаньня грошай. Жыхар Гарадзеншчыны Васіль, шукаючы кватэру ў сталіцы, хацеў забіць адразу двух зайцоў. «Зарабіў грошы, і невядома, што будзе зь бізнэсам далей, вось і думаю ўкласьці», — падзяліўся бізнэсовец плянамі ў лістападзе мінулага году. Спачатку думаў набыць такую кватэру, каб у ёй пры неабходнасьці можна было б зрабіць офіс. Але жонка падала Васілю лепшую ідэю: дзеці-старшакляснікі праз колькі гадоў паедуць у Менск вучыцца, дык заадно будзе для іх кватэра.


WWW.RIELT.BY

**Двухузроўневая кватэра ў малакватэрным доме на вуліцы Вясновай у сталіцы цяпер каштуе 210 тысяч даляраў.**

Набываць «абы-што» ў Менску гарадзенцу не хацелася, і ягоныя крытэры пошуку цягнулі на сапраўднае элітнае жытло, якога ў Менску будуецца ня так шмат, як падаецца. Нават з улікам усіх магчымых пазыкаў ды крэдытаў новая трохпакаёўка ў цагляным доме непадалёк ад цэнтру па лініі мэтро магла зацікавіць Васіля выключна як экспанат выставы: на набыцьцё такога шчасьця не хапіла б грошай. Дарма паспрачаўшыся зь некалькімі рыэлтэрамі, Васіль урэшце зарыентаваўся ў менскіх цэнах і адкінуў ідэю цэнтру. Але ад вялікай кухні, цэглы, трох пакояў і пэўных раёнаў не адступіўся. Ясна, што пошукі жаданага «даху над галавой» у зададзеных коштавых рамках цягнуліся марудна. У дадатак, пабачыўшы, што трохпакаёўкі ў цэгле да тысячаў 120 у.а. часьцей прапануюцца без аздобы — штукатураныя сьцены ды падлогасьцяжка, а часам увогуле вольная пляніроўка без падзелу на пакоі, Васіль быў азадачаны. «Гэтыя аздобы — зашмат гемарою, — сказаў ён. — Калі ня браць лепшага, лепш нічога ня браць. Што людзі скажуць?» — «А што людзі? Навошта вам кватэра за 200 тысяч, якіх няма? Лепш без пазыкаў за 100, а потым заробіце і даробіце. Да вучобы дзяцей акурат будзе хоць пара жылых пакояў». Васіль пагадзіўся, але хутка перадумаў. Нездарма, відаць, так моцна хваляваўся за бізнэс...

Потым з гэтым чалавекам здарылася тыповая гісторыя. Прагледзеўшы ў Менску сем кватэраў, ён знайшоў-такі тое, што шукаў — зусім у іншым раёне, чым думаў. Затое з рамонтам і праз адзін прыпынак ад мэтро. Але тут мінуў Новы год, і над Васілём пажартаваў рынак. Трэба аддаць належнае стратэгічнаму мысьленьню гарадзенца: ён заранёў спрабаваў нешта спрагназаваць. «Калі дзяржаве давядзецца шмат плаціць за газ, а насельніцтву — за камунальныя паслугі, людзі пачнуць пазбаўляцца ад «лішніх» мэтраў, мяняць кватэры на меншыя. Значыць, трохпакаёўкі мусяць патаньнець, — разважаў Васіль. — То я хіба пачакаю?» Усе яго знаёмыя рыэлтэры пацьвярджалі, што студзень і люты — амаль што «мёртвыя» месяцы на рынку жытла, але не браліся нешта прагназаваць. (Трэба сказаць, што і цяпер ніхто не бярэцца). Акрамя таго, што рост коштаў на жытло наўрад ці спыніцца — хіба на вялікія кватэры запаволіцца... Але нават гэта не збылося.

Васіль так і ня ўклаў сваіх капіталаў. Перашкодзіла асьцярожнасьць. Пакуль ён чакаў і выгадваў, прадавец аблюбаванай кватэры знайшоў ня толькі патрэбны яму варыянт абмену, але і двух новых ахвотнікаў набыць ягонае жытло. Пры тым, што за тыдзень гэтых пошукаў кватэры падаражэлі, і прадавец, якому з розьніцы цэнаў трэ' было яшчэ вяртаць крэдыт на будаўніцтва, таксама падвысіў цану сваёй на 2 тысячы даляраў. Пакупнікі аднachасова прыехалі ў агенцыю нерухомасьці, празь якую мусіла прайсьці ўгода, і ўчынілі торг. У самы разгар перамоваў у пакой убег наш герой, на якога ўсе ўжо забыліся з-за неканкрэтнасьці, і назваў самую вялікую лічбу. Атрымлівалася, што за паўтара тыдні кватэра падаражэла ажно на 8 тысячаў. А празь некалькі дзён Васілю не далі абяцанага крэдыту, і кватэрка «сплыла». Цяпер ён сядзіць дома і згадвае пра іншыя шэсьць варыянтаў.

З канца леташняга году сталі няўхільна падымацца цэны на будаўніцтва новых кватэраў. Нават без уліку за-

тратаў на аздабленьне на кожны квадратны мэтар у новазбудаванай кватэры трэба мець 1300—1500 даляраў ЗША. Што датычыць нянових кватэраў, якія ўжо мелі аднаго ці некалькіх уладальнікаў (другаснага рынку жытла), то і тут цэны вагаюцца прыкладна ў гэткіх самых межах.

Паводле дадзеных аб'яднанай базы агенцтваў нерухомасьці Менску, у першы тыдзень лютага сярэдні кошт квадратнага мэтру агульнай плошчы ў менскай 1-пакаёўцы складаў 1465 даляраў ЗША, у 2-пакаёўцы — 1336 даляраў, у 3- і 4-пакаёвых кватэрах — адпаведна 1251 і 1126 даляраў за 1 «квадрат». У першы тыдзень студзеня мэтар 1-пакаёўкі каштаваў 1350 у.а., 2-пакаёўкі — 1245, 3-пакаёўкі — 1178, 4-пакаёўкі — 1070.

У другой палове лістапада гэтыя лічбы складалі адпаведна 1262, 1167, 1122 і 1033 даляры за мэтар.

А што цяпер? 20 лютага сярэдні кошт мэтра 1-пакаёвай кватэры склаў ужо 1520 у.а. (узрос за тыдзень на 75, зь лістапада — на 258 у.а), 2-пакаёвай — 1378 (адпаведна на 42 і 211), 3-пакаёўкі — 1284 (на 33 і 162) і 4-пакаёўкі — 1151 (на 25 і 118).

Такім чынам, у сярэднім за мінулы тыдзень мэтар жытла ў менскіх кватэрах падаражэў на 44 даляры, а за апошнія 3 месяцы — на 187. Пры гэтым у сьнежні 2006 г. кошты расьлі ў чатыры разы павольней, чым у лютым 2007-га. Своеасаблівым «водападзелам» стала менавіта мяжа году зь яе канчатковым вызначэньнем тарыфаў на расейскія энэрганосьбіты і трубаправоднымі скандаламі.

Натуральна, найбольш церпяць ад дзікага скачку рынку нерухомасьці сацыяльна неабароненыя пласты грамадзтва. Адна справа — укласьці «лішнія» сто тысячаў у панэльны дом замест цаглянага ці набыць «брэжнеўку» зь 7-мэтровай кухняй замест новабудоўлі з 12-мэтровай. Зусім іншае — пахаваць на няпэўны час надзею на свой кут, на набыцьцё якога ня хопіць ніякага крэдыту. У не на шмат лепшым становішчы людзі, якія «свой кут» ужо маюць, але яго мяняюць.

Валянціна хоча разьехацца з сынам, зь якім жыве ў вельмі блізкім — адразу за акружной дарогай — прыгарадзе ў тыповай трохпакаёўцы. Замест яе яна хоча аднапакаёўкі ў прыгарадзе і ў Маскоўскім раёне. Пакупніка на сваю кватэру жанчына знайшла, але сустрэчным варыянтам даць рады няма як. Якая будзе даплата, адказаць ня можа, але малая, бо яна пэнсіянэрка. Валянціне знаходзяць адносна танную кватэру ў Заслаўі і (на выбар) у вёсцы па Слуцкай шашы, а таксама хрушчоўку на першым паверсе ў Маскоўскім раёне. Калі знойдзе яшчэ 9 тысячаў, варыянт рэальны. Вёску яна адмятае адразу, хоць тая і бліжэйшая за Заслаўе; Маскоўскі раён прымае, але «вы ня ведаеце майго сына, ён ня пойдзе на першы паверх». У прыгарад сын ня пойдзе таксама. Ёй прапаноўваюць іншы раён сталіцы — высьвятляецца, што сыну пойдзе хіба толькі Фрунзэнскі. Адзін з самых дарагіх.

«Прабачце, колькі гадоў вашаму сыну, хіба ён гэтага не разумее?» — «Дваццаць сем яшчэ». — «То, можа, ён сам возьме крэдыт? У яго заробак наўрад ці як ваша пэнсія, яму больш дадуць». Валянціна цяжка ўздыхае. «Не, мае дзеці прывыклі, што ўсё раблю я...» Пакуль маці пераконвае яго ўдарыць палец аб палец, танная кватэрка ў Заслаўі зьнятая з продажу, а іншыя варыянты даражэюць. «Ваша кватэра таксама стала трохі даражэйшай». — «А як жа мой пакупнік?» — «А як жа вы самі? Іншага знойдзем». Але ўся апэрацыя хутка губляе сэнс: сын патрабуе, каб добрая мама перавезла яго ў цэнтар Менску. Толькі што там сям'я зможа набыць у самым лепшым выпадку адну аднапакаёўку...

Не, гэта не кватэрнае пытаньне псуе людзей — здаецца, яно проста ёсьць люстэркам, лякмусавай паперкай.

У іншай маёй знаёмай, Антаніны, дзеці таксама жадаюць пераехаць у асобнае жытло, але калі не хапіла грошай на набыцьцё, усе гуртам знайшлі варыянт будаўніцтва — між іншым, за рысай Менску. «Нічога, сын кажа: унукі будуць здаравейшыя, там жа лес, паветра»... Дарэчы, дамовы на долевае будаўніцтва не ўкладаліся практычна нідзе амаль месяц з пачатку году — будаўнічыя кампаніі тэрмінова перагледалі расцэнкі ў бок іх павелічэньня, што таксама стала наступствам падвышэньня коштаў на энэрганосьбіты.

У другасным сэктары рынку нерухомасьці попыт цяпер значна перавышае прапанову. Частка патэнцыйных прадаўцоў вырашаюць пачакаць. Нават калі рост цэнаў запаволіцца, што пакуль ня факт, пры чыстым (без абменаў) продажы можна будзе атрымаць грошай болей. Акрамя таго, людзі баяцца абвалу беларускага рубля і аддаюць перавагу грашам, закладзеным у нерухомасьць.

Тым часам малая колькасьць чыстых продажаў моцна абмяжоўвае прапанову і, у сваю чаргу, дапамагае цэнам «падрастаць». Рыэлтары, у якіх паболела апэрацыяў, зьвязаных з абменам жытла, хапаюцца за галаву. «Калі зараз мы заключымся, то пасьпеем прадацца»; «Нам падвысілі «сустрэчку» на 20 тысячаў, мы ў поўным пралёце!»; «Мой ланцуг можа ляснуцца. Калі гэта спыніцца?»

Ланцужкі прадаўцоў і пакупнікоў, якія ўладжваюцца рыэлтэрамі пры абменах, становяцца ўсё даўжэйшымі, бо ёсьць шмат шанцаў знайсьці патрэбныя варыянты, якія таксама мяняюцца. За час пошукаў удачы — варыянтаў з чыстым продажам — з ланцужка можа выпасьці нейкае зьвяно. Прычыны могуць быць розныя, але хістаньні цэнаў толькі абвастраюць гэтую сытуацыю. Некаторыя кватэры даражэюць яшчэ на стадыі іхняга прагляду першымі патэнцыйнымі пакупнікамі. Абсалютным рэкордам для ня самай лепшай аднапакаёўкі стаў такі выпадак: прадавалася кватэра ў панэльным доме-«маласямейцы» (з доўгімі агульнымі калідорамі на 6 кватэраў паабапал ліфта) за 61 тысячу. Не скажу, праўда, дакладна, ці яе ўжо нехта набыў, але пакупнікі на таньнейшыя малыя кватэры нярэдка знаходзяцца літаральна ў першы дзень іх рэкламы. А ўжо замовамі кшталту «набуду кватэру ў Менску да 45 тысячаў» (нават «да 35»!) рыэлтары проста заваленыя. На жаль, дапамагчы гэткім ахвотнікам проста нерэальна. І чым далей скачуць цэны, тым менш, атрымліваецца, нерэальных чалавечых жаданьняў.

Напэўна, кожны памятае часы, калі можна было стаць шчасьлівым уладальнікам аднапакаёвай «хрушчоўкі» за тысячаў дванаццаць. Між тым у першай палове 90-х такія кватэры каштавалі яшчэ ўдвая таньней. Мой знаёмы пераехаў у падобнае жытло зусім блізка ад Нямігі за 6 тысячаў менавіта тады, дамовіўшыся з гаспадаром, што заплаціць ягоныя страшэнныя камунальныя пазыкі. Гаспадар прасіў таксама скрынку гарэлкі... Вось толькі «няма таго, што раньш было», — пакуль выйдзе гэты матэрыял, я ня маю пэўнасьці, што сярэдняя 34-мэтровая «хрушчоўка» ў тым самым раёне не дарасьце з 52 тысячаў да якіх 55.

Зрэшты, зірнуўшы на рост коштаў больш па-філязофску, варта прыгадаць: за сьмешныя кошты ў 300 даляраў кватэры прадаваліся, напрыклад, у Грозным падчас вайны. Наўрад ці знойдзецца суайчыньнік, што пагадзіўся б на гэткае шчасьце…

# Кляштар з прэзыдэнцкім

Яшчэ адзін квартал старога Менску заменяць муляжом. У рукі карэспандэнта «НН» трапіў таемны праект перабудовы кляштару бэрнардынаў. Піша **Сяргей Харэўскі**.

Больш за пятнаццаць гадоў менскія вернікі дамагаюцца вяртаньня адабранага яшчэ ў 1863 г. кляштара з касьцёлам Сьвятога Язэпа. Улады спасылаліся на брак сродкаў, на адсутнасьць памяшканьняў для архіву, на немагчымасьць адсяленьня вайсковае камэндатуры і г.д. У рэдакцыю «НН» трапіў дакумэнт, распрацаваны «Менскпраектам». «Менскпраект» прадугледжвае выкарыстаць тэрыторыю і будынкі кляштару пад «гатэльны комплекс на 84 нумары (160 пражываючых) зь неабходным наборам спадарожных памяшканьняў», у тым ліку паркінгам і басэйнам. І, як адзначаецца ў дакумэнце, старшыня Менгарвыканкаму Паўлаў рашэньнем № 1012 ад 25 траўня 2006 году выдзяліў з бюджэту на «рэканструкцыю і рэстаўрацыю помніка XVII—XVIII ст., комплексу будынкаў № 6, 8 па вуліцы Кірылы й Мяфода з прыстасаваньнем пад гатэльны комплекс і аб’екты гандлёва-бытавога прызначэньня з аб’ёмам капітальных укладаньняў 1.400 млн рублёў». Праект перабудовы кляштару бэрнардынаў пад гатэль з забаўляльным цэнтрам зрабіла група на чале з Рыбнікавым, у ім бралі ўдзел архітэктары й інжынэры Малаткова, Еркавіч, Балотнікаў й Харламаў. Ані пра якае культурна-асьветнае прызначэньне ўнікальных помнікаў, ані пра іх вяртаньне законным уласьнікам — каталіцкай царкве — гаворка не вялася.


МІНСКІ ГАРАДСКІ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ (Мінскі гарвыканкам)
РАШЭННЕ
г. Мінск

МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ (Минский горисполком)
РЕШЕНИЕ
г. Минск

25 мая 2006г. № 1012

О внесении изменений и дополнений в показатели прогноза социально-экономического развития города Минска на 2006 год


г. Минска» с объемом капитальных вложений 1 100 млн. рублей;
«Реконструкция и реставрация памятника архитектуры XVII-XVIII в.в. - комплекса зданий №№ 6, 8 по улице Кирилла и Мефодия с приспособлением под гостиничный комплекс и объекты торгово-бытового назначения» с объемом капитальных вложений 1 400 млн. рублей;
3.3. увеличить КУП «Минская спадчына» объем капитальных вложений по объекту «Реконструкция с восстановлением здания № 4 по


решения.
3. Контроль за исполнением настоящего решения возложить на заместителя председателя горисполкома Кушнера В.Я.

Председатель М.Я.Павлов
Управляющий делами М.Ф.Саванович

Тымчасам кіраўніцтва Касьцёлу ў Беларусі зьвярталася да ўладаў яшчэ ў красавіку 2005 году з патрабаваньнем вярнуць храм Сьвятога Язэпа і кляштар бэрнардынцаў. Меркавалася, што архівы пераедуць у Нацыянальную бібліятэку. Але ні рашэньня на гэты конт, ні грошай на рамонт і пераезду архіў няма. На прыступках былога касьцёлу сьвятога Язэпа і кляштара бэрнардынцаў да сёньня моляцца парафіяне розных менскіх касьцёлаў.

Увесь квартал паміж вуліцамі Герцэна, Гандлёвай і Кірылы й Мяфода зойме сучасны гмах з бэтону й шкла з шклянымі галерэямі і купалам пасярэдзіне. Новы пяціпавярховік зьнявечыць абавязковую для сакральнае архітэктуры жорсткую герархію аб’ёмаў: сьвятыня—кляштар—гаспадарчыя пабудовы.

У Беларусі ад XVII ст. склалася традыцыя, паводле якое будынкі калегіюмаў і кляштараў мелі сьціплую, але рытмічную й рэгулярную ордэрную аздобу ў выглядзе пілястраў, лапатак і вялікіх гзымсаў, а гаспадарчыя й дапаможныя пабудовы былі пазбаўленыя пластычнага дэкору. Дамінантаю кляштарных ансамбляў мусіў быць галоўны фасад храму. «Менскпраект» руйнуе гэты прынцып, ствараючы чужародныя пластычныя акцэнты па пэрыметры ўсяго кварталу.

Не адпавядае традыцыйнаму прынцыпу й суцэльны фронт забудовы. Акурат «стоячымі паасобна» будынкамі славіўся стары Менск. Пра гэту санітарную і экалягічную выгоду з

# люксам



захапленьнем пісалі падарожнікі ў XVIII — XIX ст.. Мяняюцца абрысы кляштарных дахаў на вальмавыя мансарды са шклопакетамі. Навабуд перакрые спрадвечны выгляд на кляштар і касьцёл з боку Сьвіслачы й Траецкай гары. Новыя будынкі сказяць ўвесь горадабудаўнічы асяродак: рэальныя помнікі апынаюцца ў падпарадкаваным стане, у чужым стылістычна асяродзьдзі. Непапраўна скажаецца аўтэнтычны абрыс кварталу. Нівэлюецца рэльеф, што цяпер мае натуральныя перапады 9,6 м.

У навамодны будынак часткова «будуць уключаныя фрагмэнты йснуючай бутавай кладкі». Вось і ўвесь клопат пра аўтэнтычныя старажытныя муры.

Праектам не прадугледжаныя рэгулы адносна матэрыялаў, таму будзе шмат зіхоткага шкла, будуць і бэтон з сылікатам і плястыкавыя шклопакеты... Ня будзе ані дрэва, ані каменнага бруку, ані керамічнае дахоўкі. Адно толькі «колер пакрыцьця даху імітуе чарапічнае пакрыцьцё». Каб хоць фармальна «прывязацца» да ўнікальнага гістарычнага асяродку, праекціроўшчыкі вырашылі «ўпрыгожыць» фасады эклектычным дэкорам. Хоць ані гэты безгустоўны дэкор, ані плястыка фасадаў ня маюць нічога супольнага з помнікам. Слабае веданьне традыцыяў выдае нават каляровае вырашэньне «Менскпраекту»: «Фасадныя плоскасьці пафарбаваныя ў тэракотавы, вохрыстыя колеры». Але, паводле шматлікіх сьведчаньняў, у канцы XVIII—пач. XIX ст. у Менску былі «зялёныя ці жоўтыя дамкі з чырвонымі дахамі, узорыстымі аканіцамі й кратаванымі агароджамі».

Затое у падземным узроўні прадугледжаны «паркінг на 68 машына-месцаў, загрузачны дэбаркадэр рэстарана; на першым паверсе знаходзяцца крамы, заля рэстарану на 50 месцаў, падсобныя памяшканьні рэстарану, боўлінг, більярд, бізнэс-цэнтар, адзяленьне сувязі, пасаж, ніжняе фае, эскалятар, басэйн з саўнай, фітнэс, цырульня, салярый, касмэтычны салён». Прадугледжаныя ліфты й эскалятары, адкрыты тэнісны корт! А на пятым паверсе будзе прэзыдэнцкі люкс.

Затое нідзе ў праектнай дакумэнтацыі я не знайшоў згадак пра археалягічныя раскопкі, вывучэньне аўтэнтычных муроў кляштару (напрыклад, на прадмет наяўнасьці фрэсак) — таго, без чаго падобны праект немагчыма ўявіць у цывілізаваным сьвеце.

Самы каштоўны аўтэнтычны помнік Верхняга гораду, ансамбль кляштару бэрнардынаў, перастае існаваць. На адны праектныя работы толькі летась і былі патрачаныя 1400 млн рублёў!

Гатэлі, басэйны, корты й прэзыдэнцкія люксы патрэбныя сталіцы. Але: а) чаму іх не паставіць на іншым беразе ракі ці каля музэю ВАВ; б) навошта беспардонна хлусіць і называць зьнішчэньне помнікаў дзеля рэалізацыі бізнэс-праектаў «рэстаўрацыяй» і «клопатам пра спадчыну»? Навошта скажаць сьвядомасьць і сваю й народу? Бо падваеньне сьвядомасьці ў праекціроўшчыкаў зь «Менскпраекту» відавочнае: у адным радку яны пішуць: «Асноўныя пад'езды зьдзяйсьняюцца з боку вул. Кірылы й Мяфода..., гаспадарчы — зь верху вул.Герцэна», а праз радок: «вуліцы Герцэна, Крылы й Мяфода запраектаваныя пешаходнымі».

Адзіна справядлівым і цывілізаваным рашэньнем было б вярнуць сьвятыню каталікам. Лягічна было б адрэстаўраваны кляштар прыстасаваць акурат пад архіў-музэй літаратуры й мастацтва з мастацкай галерэяй, экспазыцыйнай і чытальнай залямі.... Мела б нават сэнс закансэрваваць ўсе будынкі й рэшту муроў з мэтаю стварэньня экспрымэнтальна-навучальнае базы для будучых рэстаўратараў і археолягў... Але кіраўніцтва краіны мае на гэта ўсё свой погляд. А «рэстаўратары» і «ахоўнікі» радыя дагадзіць. Ня дзіва: за такія грошы!

**Кляштар бэрнардынаў**

заснаваны ў 1624 г. Фундавалі Андрэй Кансоўскі й яго брат Ян. У 1630–я бэрнардыны ўзьвялі драўляныя касьцёл і канвэнт. Пасьля пажару да 1652 быў збудаваны каменны касцёл і кляштар. Пасьля рэканструкцыі 1752 будынкі набылі цяперашнія рысы. У к. XVIII ст. комплекс складаўся з касьцёлу, брацкага корпусу, жылых дамоў, трапезнай, школы, шпіталю, стайні, піваварні. Быў абнесены каменнай агароджаю з брамамі. На старасьвецкіх плянах бачны сонечны гадзіньнік пасярод кляштарнага двара. Дамінантай комплексу быў фасад касьцёлу з высокім франтонам. Вянчала кампазіцыю фасаду «малы купалок», падобная да яе сыгнатурка завяршала дах над прэзбітэрыем. У нішах фасаду стаялі фігуры сьвятых, у вокнах — тры званы.

Сьвятыню ўпрыгожвалі 9 атынкаваных і дэкараваных лепкаю алтароў. На хорах былі арганы на 10 галасоў. У XIX ст. іх замянілі шыкоўныя арганы «на 22 галасы і з 4 мяхамі». У крыпце пахаваныя Завішы, Кансоўскія, Тышкевічы... Да паўночна–заходняга фасаду касьцёлу далучаўся «кляштар мураваны ў тры лініі, у дзвюх лініях уздоўж па другі паверх, а ў трэцяй папярэчнай, бо пад гарою пабудаваная, тры паверхі... лініі замыкаюць квадрат з агародам і альтанкаю з кветкамі». У карпусах былі кельлі манахаў, рэфектар. Пры кляштары дзейнічала школа філязофіі. Бібліятэка бэрнардынаў лічылася найбуйнейшай у Менску.

У 1864 касьцёл прыстасавалі пад праваслаўную палкавую царкву Сьв.Кірыла і Мяфода (з 1872 пад архіў), а карпусы пад казармы Каломенскага пяхотнага палка і следчую камісію. У 1983 касьцёл часткова рэстаўраваны (арх. Г. Босак). Зьявіўся франтон, чарапічны дах. Інтэр'ер у пачатку 1960–х панявечаны перакрыцьцямі на 5 паверхаў. Тут размяшчаецца Архіў навукова–тэхнічнай дакументацыі і Архіў літаратуры і мастацтва, у карпусах — ваенныя камендатура і пракуратура. У правы бок ад парталу былі старажытныя могілкі XVII ст., так званыя «бэрнардыны». Іх зьнішчыла ў 2002 г. ТАА «Стары Менск» падчас будаўніцтва рэстарану.

# Дэжавю

Санкт–Пецярбург у суботу нагадаў Менск узору 1997 году. Піша **Віталь Тарас**.

### «Гэты горад — наш»

«Удзельнікі маршу, замест таго каб рушыць на 4-ю Савецкую, як было заяўлена, пайшлі проста — па праезнай частцы Лігаўскага праспэкту. 4-я Савецкая была перакрытая «Ўралам» АМАПу, аднак міліцыя не чакала, што дэманстранты пойдуць на Лігаўскі. Каб спыніць іх, АМАП выставіў ачапленьне вакол станцыі мэтро «Плошча Паўстаньня». Аднак натоўп прарваў ачапленьне, і каля трохсот чалавек выйшлі на Неўскі праспэкт...»

Калі ў гэтым паведамленьні памяняць Лігаўскі праспэкт на вуліцу Багдановіча, а Неўскі — на праспэкт Скарыны, уражаньне такое, што дзеяньне адбываецца не ў Санкт-Пецярбургу ўвесну 2007-га, а дзесяць гадоў таму ў Менску. А калі яшчэ дадаць, што сярод удзельнікаў «Маршу нязгодных» быў заўважаны былы прэм’ер-міністар Расеі Міхаіл Касьянаў ды ўспомніць пра ўздел у колішніх апазыцыйных акцыях беларускага экс-прэм’ера Міхала Чыгіра — «дэжавю» будзе поўным.

Не да іроніі. Апошнія падзеі й дыскусія вакол іх у інтэлектуальных колах Беларусі вымушаюць гаварыць аб тым, што нашае грамадзкае жыцьцё нібы вярнулася на дзесяць і болей гадоў назад. Вядома, гісторыя, у тым ліку гісторыя грамадзкай думкі, паводле законаў дыялектыкі разьвіваецца ў выглядзе сьпіралі. Але прыходзяць да галавы больш простыя параўнаньні — з пачатковай школай, прагулянымі ўрокамі ды вучнямі, якіх пакінулі на другі або трэці год.

Дзесяць гадоў таму ішла чачэнская вайна. Дагэтуль няма дакладных зьвестак аб колькасьці яе ахвяраў. Паводле прыблізных ацэнак расейскіх праваабаронцаў, пачынаючы з 1994 г. на вайне загінулі каля 18 тысяч фэдэральных вайскоўцаў і каля 70 тысяч мірнага насельніцтва. Называюць лічбы і ў 100 тысяч чалавек.

Ніхто не асуджаны за ваенныя злачынствы. Нават само пытаньне аб гэтым у Расеі ніхто не ўздымаў.

Прытым што дзесяць гадоў таму было неяк няёмка гаварыць аб сапраўднай дэмакратыі ў Расеі, хаця дэмакратычных правоў і свабодаў там было нашмат больш, як цяпер. Сёньня ў «паваеннай», кадыраўскай Чачэніі па-ранейшаму шырока практыкуюцца выкраданьні людзей і катаваньні зьняволеных. Аб гэтым афіцыйна заяўляе ў Маскве чыноўнік Эўразьвязу па правах чалавека. Ніякай рэакцыі. Але ніхто яго словаў і не абвяргае.

Прэзыдэнт Расеі Пуцін дае згоду на прызначэньне Рамзана Кадырава, падазраванага ў датычнасьці да катаваньняў, выкраданьняў людзей, забойства журналісткі Ганны Паліткоўскай і іншых злачынстваў, прэзыдэнтам Чачэнскае рэспублікі. Неабмежаваная ўлада перадаецца цяпер, як у сярэднявеччы, ад бацькі да сына. І Масква гэта бласлаўляе. Галоўнае, каб Кадыраў прызнаваў сваю васальную залежнасьць ад сюзэрэна ў Крамлі.

### Экспарт «сувэрэннай дэмакратыі»

За апошнія дзесяць гадоў у РФ, паводле зьвестак Саюзу журналістаў Расеі, загінулі каля 300 рэпартэраў. Толькі ў 2006 г. былі забітыя 9 журналістаў, уключна з Ганнай Паліткоўскай. Гэта адбываецца ў мірны час.

У абсалютнай большасьці выпадкаў забойцы ня знойдзеныя. А шмат у якіх выпадках (як, напрыклад, з атручваньнем былога дэпутата Дзярждумы журналіста Юрыя Шчакачыхіна) іх і не шукалі. Дагэтуль ня знойдзеныя заказчыкі забойства дэпутаткі Дзярждумы Галіны Старавойтавай, якая ўзначальвала партыю «Дэмакратычная Расея». «Дэмакратычнай Расеі» цяпер няма.

Такія дробязі, як забойствы на нацыянальнай глебе, ператварэньне выбараў усіх узроўняў у фарс, адзяржаўленьне Грамадзкага расейскага тэлебачаньня, усіх фэдэральных і буйных рэгіянальных тэлекампаніяў ды пэрыядычных выданьняў, паўторны суд над Хадаркоўскім і Лебедзевым, якія адбываюць пакараньне ў сібірскіх лягерах строгага рэжыму, пакінем у баку як неістотныя.

Істотна, што частка апазыцыі й журналістаў у Беларусі, нягледзячы на відавочнае, працягваюць пераконваць нас, што Расея абагнала Беларусь паводле ўзроўню дэмакратыі «гадоў на пятнаццаць».

Цікава, што крамлёўскія ідэолягі апошнім часам нават не спрабуюць супастаўляць узровень расейскай дэмакратыі з эўрапейскім. Проста кажуць, што заходняя дэмакратыя й культура чужыя расейскай духоўнасьці й ладу жыцьця. Які на галаву вышэй за любы іншы лад. Раней такую дэмакратыю называлі савецкай, цяпер — сувэрэннай.

Усьлед за Лукашэнкам Суркоў і падобныя да яго маглі б усклікнуць: «Мы свой народ за цывілізаваным сьветам не павядзём!»

Нам упарта спрабуюць давесьці — і ў Маскве, і дома, — што Беларусі трэба пазычыць дэмакратыю ў Расеі, грамадзкі лад у якой быў і застаецца адзіным для нас узорам і альтэрнатывы якому нібыта няма. Тыя, хто дагэтуль адчуваюць сябе часткай Расеі альбо духоўна, крэўна ці як хочаш яшчэ павязанымі зь ёй, шчыра вераць у яе мэсіянскую ролю. Але чаму трэба навязваць свае каштоўнасьці, прынцыпы і ўяўленьні іншым народам? Калі вы за дэмакратыю, хай сувэрэнную, чаму ня даць народу сувэрэннай дзяржавы самому вырашаць свой лёс?

Абсалютна нармальная справа — гандляваць, супрацоўнічаць у сфэры эканомікі, навукі, культуры з суседняй краінай. Супраць гэтага ніводзін нармальны чалавек у Беларусі ніколі не выступаў і ня будзе выступаць. І зусім іншая рэч — браць дзяржаўны і грамадзка-палітычны лад суседняй краіны за ўзор, больш за тое — разглядаць уласную краіну, яе народ з уласнай гісторыяй як частку гісторыі іншае краіны, як нешта другаснае, што ня мае самастойнай ролі і каштоўнасьці.

### «Інь» і «Янь»

Гэта можа падацца наіўнай абстракцыяй, чымсьці такім, што тычыцца выключна сьветапогляду пэўных індывідуумаў.

Але гэты сьветапогляд у рэальнасьці часта набывае практычны сэнс. Яго можа выказваць кіраўнік дзяржавы, які гаворыць, што беларускі і расейскі народы — адзінае цэлае, бо паходзяць з аднаго дрэва (прыблізна тое самае сказаць — што ўсе людзі паходзяць ад

Працяг на старонцы 18.

# Антырэвалюцыйны спэктакль паводле Караткевіча

У Тэатры Беларускай арміі, у драматургіі Дударава. Піша **Антон Тарас**.

**Драматычны тэатар Беларускай арміі. Вераб'іная ноч.**

Драма ў адной дзеі.

**Аўтар:** Аляксей Дудараў

**Рэжысэр:** Марына Дударава

**Сцэнаграфія й касьцюмы:** Вольга Мацкевіч

**Кампазытар:** Уладзімір Кандрусевіч

На сцэне Драматычнага тэатру Беларускай арміі адбылася прэм'ера драмы «Вераб'іная ноч» паводле пралёгу да раману Ўладзімера Караткевіча «Леаніды ня вернуцца да зямлі». Спэктакль сабраў поўную залю, але значную частку гледачоў складалі курсанты МА і МУС. На прэм'еры прысутнічалі кіраўнікі Міністэрства культуры й ДТБА, а таксама паэт Генадзь Бураўкін.


БЕЛТА

## Сюжэт

Дзеяньне адбываецца падчас паўстаньня Кастуся Каліноўскага. Жонка паўстанца Грынкевіча вязе асуджанаму на сьмерць мужу загад аб памілаваньні. Каб выратаваць каханага, засталося толькі пераправіцца паромам праз Дняпро. Рака шалее, надыходзіць «вераб'іная ноч» — час буры й навальніцы. А пераправу ахоўваюць царскія жаўнеры...

## Пастаноўка

Адным з галоўных герояў дзеі зьяўляецца бура, таму першае, што варта адзначыць, — гэта гук, асьвятленьне й дэкарацыі, дзякуючы якім спэктакль атрымаўся ў вялікай ступені атмасфэрным. Не было маланак, якімі запомніўся «Паром на бурнай рацэ» Бокуна (экранізацыя пралёгу да «Леанідаў...»), але стыхія не давала пра сябе забыцца.

Акрамя таго, рэжысэр вельмі ўдала ператварыла залю ў раку — калі акторы глядзяць на публіку, нібы на Дняпро, а вакол сьвішча вецер і плёскаюць хвалі, глядач на імгненьне можа адчуць сябе струмянём-часткай агульнай плыні, роля якой адводзіцца аўдыторыі.

## Мова

Пэрсанажы, за выключэньнем аднаго з жаўнераў, гавораць па-расейску. Іранічна, што ў Караткевіча той жаўнер быў маскоўскім расейцам. Але падчас прагляду варта не забывацца, што на сцэне — не Караткевіч, а Дудараў.

## Пасланьне

Рэвалюцыянэраў трэба зьнішчаць, бо першым зь іх быў Сатана. Сьвет вялікі, яго хопіць на ўсіх, а хлеб аднолькава смачны, на якой мове яго ні называй. І галоўнае, каб «нашыя» й «вашыя» ўнукі ніколі не ваявалі паміж сабой.

## Падтэкст

Паўстанцы Кастуся Каліноўскага ў «Вераб'інай ночы» прадстаўленыя ня лепшым чынам. Каб трапіць на паром, жонка Грынкевіча гатовая забыцца на гонар, прапануючы сваё цела афіцэру Пора-Леановічу (чаго ў Караткевіча не было) — нараджэнцу Беларусі, які служыць Расейскай імпэрыі. Пазьней гледачу намякнуць, што й памілаваньне для мужа Грынкевічыха здабыла падобным чынам. Леановіч высакародна адмаўляецца ад прапановы кабеты, пераконвае яе ў заганнасьці каліноўцаў ды рэвалюцыянэраў наагул.

Той факт, што каліноўцамі ў наш час называюць удзельнікаў пасьлявыбарчых падзеяў мінулага году, наводзіць на пэўныя разважаньні, тым больш, што п'еса фінансаваная з прэзыдэнцкага фонду й разьлічаная на аўдыторыю ДТБА.

## Супастаўленьне

«Галоўным быў ня хлеб. Галоўнай была свабода».

*Уладзімер Караткевіч, «Леаніды ня вернуцца да Зямлі»*

«Яго трэба адчуць, дэшыфраваць, раскадаваць... і тады надыдзе палёт».

*Аляксей Дудараў пра Ул.Караткевіча*

## Выснова

Караткевіч перавярнуўся ў труне. Клясыкі ня любяць, калі ў іх скажаюць сутнасьць, а сутнасьцю пісьменьніка Караткевіча былі ягоныя нацыянальныя перакананьні.

У гэтым аглядзе наўмысна не гаворыцца пра рэжысуру й актораў, паколькі стваральнікі «Вераб'інае ночы» выйшлі за межы тэатральнага мастацтва й зьвярнуліся да мастацтва прапаганды. Вызначыць, наколькі добра рэжысэр і акторы перакаралі гледача ў праўдзівасьці свайго пасланьня, ня так і проста, калі не належыш да мэтавай аўдыторыі.

Адзінае, што хацелася б заўважыць: у дадзеным выпадку хістач прапаганды можа вагнуцца ў адваротным кірунку, калі пасьля прагляду падробкі ў гледача ўзьнікне жаданьне зьвярнуцца да арыгіналу.

# Фальсыфікацыя маралі, або Купала па-гарадзенску

У Гарадзенскім абласным драматычным тэатры паставілі знакамітую трагедыю Янкі Купалы «Раскіданае гняздо». Піша **Андрэй Павач**.

10 сакавіка ў адной з найбольш знакамітых канцэртных заляў Менску мае прайсьці вялікі канцэрт з падборкай найлепшых нумароў зь нядаўна ўзьніклай на АНТ гумарыстычнай праграмы «Comedy club». Гледачоў настойліва запрашаюць прыняць удзел у гэтым мерапрыемстве або хоць бы глядзець сам «Comedy club» вечарамі ў нядзелю. Паддаўшыся ўзьдзеяньню такога актыўнага «тэлевізійнага спаму», я вырашыў дачакацца нядзельнага вечара і пазнаёміцца з новым тэлепраектам.

Гумар, які гучаў са сцэны, я абмяркоўваць не хачу. Яго проста не было. Хіба ж можна назваць гумарам гісторыю дзяўчынкі, якая засунула ў рот свайму дзеду пажарнае рукаво за тое, што той патапіў кацянятак. За палову гадзіны перадачы выступоўцы ня менш як дзесяць разоў выкарыстоўвалі адборны «русский мат», ды такі, што гукарэжысэры вымушаныя былі яго заглушаць. Чаго вартая толькі прымаўка: «Этого не может быть. Пили, бл…, и будем пить». У перапынках паміж нумарамі на сцэне танцавалі прафэсійныя стрыптызэркі ў адзеньні, якое толькі зь вялікімі агаворкамі можна назваць сукенкамі. За дзеяньнем назіралі гледачы — жыццярадасныя загарэлыя дзеўкі і хлопцы зь менскай багемы, з тых, што любяць пабавіць час у дарагіх барах ды пакатацца на лыжах у «Сілічах».

Гм, падумаў я, выключыўшы тэлевізар, атрымоўваецца надзвычай цікава: днём нам баюць пра разлажэньне маралі ў подлай Амэрыцы і Эўропе, а пад вечар падкідваюць пошласьць, якую ўбачыш не на кожным амэрыканскім канале.

Нешта падобнае дзеецца і на радыё. Да прыкладу, «жыцьцёвыя» гісторыі зь «Сямейнага радыё», якія пасьля прапануецца слухачам абмеркаваць, чым тыя пасьпяхова й займаюцца: «Дзяўчына Сьвета ў свае сямнаццаць гадоў надта пакахала бізнэсоўца Сяргея, якому было трыццаць пяць і які меў жонку ды дваіх дзяцей. Яны сустракаліся (цяпер у нас гэта называецца «сустракаліся» — **А.П.**), аж пакуль Сьвеце ня стукнула трыццаць, а Сяргей усё ніяк не хацеў браць развод са сваёй жонкай. І вось парадзьце, што рабіць няшчаснай Сьвеце: ці разьбіць цяпер сям’ю Сяргея, ці знайсьці сабе новага бізнэсоўца».

Жах ахоплівае, якія тэмы мы спакойна абмяркоўваем на сваіх кухнях. Мы, унукі сялян, якія па пяцьдзясят гадоў жылі са сваімі нарачонымі і выхавалі нашых зусім нядрэнных бацькоў. Мы ўжо зьмірыліся з тым, што больш чым 30% маладых беларусаў бяруць шлюб толькі тады, калі нявеста носіць пад сэрцам малое. Пра аборты нават гаварыць не прыходзіцца. І мы ўсё гэта ўспрымаем як данасьць.

Калі вы раптам думаеце, што прыведзеныя факты — хутчэй выключэньне, чым тэндэнцыя, то моцна памыляецеся. Маю ні з чым не параўнальны прыклад са сфэры «высокага мастацтва». Зь лістапада леташняга году гарадзенскі драматычны тэатар дэманструе знакамітую трагедыю Янкі Купалы «Раскіданае гняздо». Беларускія п’есы ставяцца ў ГДТ нячаста, болей цяпер паказваюць спэктакляў іншага кшталту, да прыкладу, камэдыю нейкага сучаснага ангельскага драматурга «Занадта жанаты таксіст», якую, дарэчы, гарадзенскае ідэалягічнае начальства ўхваліла без ваганьняў. Ідучы на Купалаву клясыку, я не спадзяваўся ўбачыць нешта сапраўды выдатнае — занадта часта пасьля словаў «Бацька павесіўся» даводзіцца цяпер чуць рогат у залі, — аднак убачанае ўразіла мяне, як той казаў, «да глыбіні душы».

Са школьнай парты ўсе добра памятаюць, што адзіны станоўчы герой у «Раскіданым гнязьдзе» — Незнаёмец, які прыходзіць на парэштку разбуранай хаты і кліча яе жыхароў ісьці на «Вялікі Сход па Бацькаўшчыну», каб разам перамагчы нябачнага, але ненажэрнага Цмока. У выніку Сымон і Зоська бягуць на Вялікі Сход, і іх учынак — адзіная надзея ў канцы трагедыі. Малады менскі рэжысэр-пастаноўшчык А.Гарцуеў дадаў у п’есу літаральна адзін эпізод у самым канцы. Незнаёмец забівае Зоську і Сымона зь вінтоўкі, за што атрымоўвае ад Паніча мяшэчак з грашыма.

Ці адчуваеце падтэкст?! Усё, спадарства, ніякай праўды няма і шукаць яе ня варта. Усе сволачы, а найбольш, канечне, рэвалюцыянэры накшталт Незнаёмца. Гэты парадак непарушны, нават калі і несправядлівы. Сядзі, маўчы і старайся выслужыцца, бо гэта, апроч джэк-поту ў «Супэрлято», твая адзіная надзея падняцца на прыступку вышэй у гіерархічнай лесьвіцы грошай, пасад, шыкоўных аўтамабіляў і ўсяго іншага, што так дорага сэрцу сучаснага беларуса.

Эпідэмія амаральнасьці захлынае Беларусь, а ў самых высокіх кабінэтах гэтага не заўважаюць або ня хочуць заўважаць, арганізоўваючы час-почас гучныя мерапрыемствы, закліканыя прадэманстраваць сацыяльную абароненасьць беларусаў.

Напрыклад, сьмешная кампанія па барацьбе з гэтак званым

«сэксуальным рабствам». Па-мойму, так ці іначай, але за мяжу людзі едуць, толькі шукаючы лёгкага (заўважце, «лёгкага» а не «лягчэйшага») жыцьця. Кожны чалавек павінен шукаць сабе вартую працу на Радзіме, а не гаварыць: «Трэба адсюль хутчэй звальваць, бо ў гэтым балоце ўсё роўна ўжо нічога не атрымаецца». Ды я ўвогуле не прамянею ад гонару за сваю краіну, калі чую, як якое-небудзь пятнаццацігадовае даўганогае дзіцятка стала сусьветнай супэрмадэльлю. Зарабляць на дадзеным Богам і продкамі выглядзе падступна. І што, беларусам хіба сапраўды няма чым сябе паказаць, апроч як тэнісам і голымі плячыма дзяўчатак з-пад Гомелю? Пачатае нядаўна змаганьне зь «няўдалымі сем'ямі» таксама нагадвае гучную піяр-акцыю, хоць у многіх яна, трэба прызнацца, знаходзіць падтрымку. «Правільна, у працоўныя лягеры іх, каб зараблялі і на сябе, і на тых, каго напладзілі», — заходзяцца бабулькі ў тралейбусах. І ніхто ня думае, што толькі ацяпленьне ў такім лягеры будзе каштаваць болей, чым уся праца паняволеных няўдачлівых бацькоў. Але што рабіць людзям, жыцьцёвая пэрспэктыва якіх становіцца ўсё больш і больш туманнай. Аднапакаёўка ў Менску каштуе сёньня каля 50 тысяч даляраў. Цэны на жыльлё толькі за адзін год падняліся працэнтаў на шэсьцьдзесят. Пляны па будаўніцтве не выконваюцца нават у супэраптымістычных справаздачах ураду. Нядаўна я быў па-сапраўднаму ўражаны, даведаўшыся, што ў адным з самых дарагіх эўрапейскіх гарадоў, Бэрліне, двухпакаёвая кватэрка каштуе 50 тысячаў эўра. Як бачыце, розьніца невялікая. Увогуле, часам складаецца ўражаньне, што ўсё беларускае грамадзтва дзеліцца сёньня не на тых, хто «за» і «супраць», і тым больш не на «правых» і «левых», а на тых, хто пасьпеў атрымаць крэдыт на кватэру і чакае, калі беларускі рубель хутчэй лясьнецца, і тых, хто на тую кватэру толькі чакае. Апошнім, ва ўмовах, калі «беларускі эканамічны цуд» служыць усё меншай і меншай колькасьці грамадзянаў, застаецца спадзявацца толькі на «Супэрлято».

Выснову з усяго сказанага мною вышэй магу зрабіць толькі адну. Лінія падзелу ў грамадзтве праходзіць сёньня не паміж дэмакратыяй і аўтарытарызмам, і нават не паміж беларушчынай і татальнай русіфікацыяй, — лінія падзелу ідзе паміж традыцыйнай хрысьціянскай маральлю, якой жылі нашыя продкі, і хамствам, распустай, абыякавасьцю да блізкага. Кожны, хто хоча нешта зьмяніць у Беларусі, хто хоча бачыць яе больш чыстай, хрысьціянскай і справядлівай, павінен стаць сьцяною паміж фальсыфікатарамі маралі і нашай моладзьдзю, якую штодзённа труцяць у аўдыторыях і з экранаў тэлевізараў. Ён павінен быць для гэтых людзей прыкладам ва ўсім. Сапраўдная беларушчына стаіць толькі поруч з сапраўднай дзядоўскай маральлю. Гэта закон, і толькі няўхільнае выкананьне гэтага закону дае надзею на пэўную Перамогу.


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Мінулае Казуліна выклікала недавер кансэрватыўнага выбаршчыка. На фота: Казулін у журы аднаго з лукашэнкаўскіх конкурсаў прыгажосьці.**



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне на поўначы Полаччыны.

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Злачынства і пакаяньне

— Ну што, раскайваемся? — намесьнік начальніка спэцкамэндатуры выпрабоўна прымружыўся, узважыў на руцэ маю «Асабовую справу» з аркушыкам *атэстацыі* на ўмоўна-датэрміновае вызваленьне і агледзеў прысутных чальцоў камісіі. — Прызнаём віну, становімся на шлях выпраўленьня — і на свабоду, так сказаць, з чыстым сумленьнем…

Прагучала двухсэнсоўна — нібыта самі міліцыянты сабраліся перад судом ды вырашаюць прызнавацца ў парушэньнях закону.

Давялося нагадаць «жандару», што менавіта пытаньне аб пакаяньні будзе першым, якое незалежны суд у дэмакратычнай Беларусі задасьць усім супрацоўнікам «органаў», што ўдзельнічалі ў палітычных рэпрэсіях у пэрыяд дыктатуры.

І з маральнага, і зь юрыдычнага гледзішча *пакаяньне* — кульмінацыйны момант у драме злачынства і пакараньня. Мяжа. Маладафронтаўцам, якіх нядаўна арыштаваў КДБ, гэтаксама прапаноўвалі напісаць пакаянныя лісты. Зь іншага боку, з пакаяньня, ужо перад сябрамі, пачаў «агент «Вэктар», студэнт праграмы Каліноўскага.

Цяпер у Беларусі багата кажуць пра нацыянальнае яднаньне, супольную абарону незалежнасьці, супрацоўніцтва апазыцыі ды ўлады. Справа, як паказвае досьвед «Салідарнасьці», гістарычна апраўданая — і найлепш з усіх гэта сфармуляваў у сваім вядомым лісьце Аляксандар Мілінкевіч.

Так, разбойнік сапраўды можа раптам зрабіцца праведнікам, разбуральнік дзяржавы — яе будаўніком, а былы фарысэй — апосталам. Уся Біблія й гісторыя хрысьціянства сьведчаць не адно пра магчымасьць, але і пра пэўную заканамернасьць падобных ператварэньняў. Урэшце, кожны грэшнік, прымаючы Ісуса Хрыста, атрымлівае ачышчэньне ад граху… і права на Валадарства Нябеснае. Ёсьць толькі адна ўмова — Пакаяньне. Шчырае, ад сэрца. І — дзея, што пацьвярджае такую шчырасьць: «Прынясеце ж годны плод пакаяньня!» (Мацьвея 3:8). У іншым выпадку гэта гульня або ваенная хітрасьць, якая рана ці позна вядзе да краху.

Заўважце, у розных інтэрвію для эўрапейцаў нейкае падабенства прызнаньня віны

## ХРОНІКА

**28 лютага**

### Аштрафавалі на паўтара мільёна

В.а. кіраўніка гомельскай абласной арганізацыі Сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Алега Шабетніка з Рэчыцы суд пакараў штрафам у 50 базавых велічыняў – 1 мільён 550 тысячаў рублёў. Яму па пошце прыйшла пастанова судзьдзі Цэнтральнага раёну Гомелю Марыны Дамненкі аб прызнаньні яго вінаватым ў незаконным перамяшчэньні праз мяжу друкаваных выданьняў. Паведамленьне пра суд у Рэчыцу прыйшло праз два тыдні пасьля судовага разбору. Судзьдзя Дамненка аштрафавала спадара Шабетніка завочна. У сьнежні летась на памежнай беларуска-ўкраінскай станцыі Церуха Алег Шабетнік разам з аднапартыйцам Сяргеем Старычэнкам былі затрыманы беларускімі мытнікамі. Яны вярталіся цягніком у Гомель з Чарнігава, дзе бралі ўдзел ва ўстаноўчай канфэрэнцыі Саюзу левых сіл Беларусі. Тады беларускія мытнікі і канфіскавалі ў сп. Шабетніка матэрыялы ўстаноўчай канфэрэнцыі, а таксама пяць асобнікаў брашуры пра культ асобы Аляксандра Лукашэнкі.

### «Бобруйский курьер» на вадзе

Гарвыканкам запатрабаваў ад недзяржаўнай газэты «Бобруйский курьер» стварыць нізавую арганізацыю Беларускага рэспубліканскага таварыства ратаваньня на вадзе колькасьцю, роўнаю штатнаму складу. Да 1 траўня трэба адправіць у аддзел ідэалёгіі гарвыканкаму справаздачу аб афармленьні інфармацыйнага стэнду ды зборы грашовых «сяброўскіх унёскаў» у памеры адной тысячы рублёў на кожнага працоўнага. Такія ж загады атрымалі ўсе суб'екты гаспадараньня ў Бабруйску.

### «МФ» абараняе музэй

1 сакавіка спаўняецца год, як быў зачынены Жлобінскі краязнаўчы музэй. Мясцовая філія незарэгістраванага «Маладога фронту» распачала збор подпісаў у падтрымку краязнаўчага музэю. У райвыканкам будуць накіраваныя адпаведныя дакумэнты з трыма асноўнымі патрабаваньнямі: аднаўленьне працы Жлобінскага краязнаўчага музэю, рэканструкцыя новага будынку музэю, прывядзеньне ў належны стан усіх вайсковых магілак, помнікаў і пахаваньняў.

### Арыштаваная маёмасьць грамадзкага аб'яднаньня «Дапамога дзецям Чарнобылю»

Мытнікі наклалі на вядучую дабрачынную структуру Гомельшчыны 330-мільённы штраф. Яшчэ ў 100 мільёнаў рублёў абыдзецца ўтылізацыя сапсаваных прадуктаў, што па віне мытнікаў так і не дайшлі да зоны. Згнілі яны на складах, арэнда якіх каштавала 50 мільёнаў. У выніку набягае каля 200 тысяч эўра.

**1 сакавіка**

### Выхад з галадоўкі Казуліна мусіць быць працягнуты

Рэжым выхаду з галадоўкі экс-кандыдата ў прэзыдэнты Аляксандра Казуліна, які адбывае пакараньне ў віцебскай калёніі «Віцьба-3», павінен быць працягнуты. Такую думку выказаў адвакат палітыка Ігар Рынкевіч пасьля сустрэчы з падабаронным. Гэты рэжым азначае вызваленьне ад працы і спэцыяльнае харчаваньне. Паводле словаў Рынкевіча, датуль, пакуль мэдыкі не дазволяць Казуліну перайсьці на агульны рэжым утрыманьня ў калёніі, ён будзе знаходзіцца ў рэжыме выхаду з галадоўкі.

(маўляў, наша памылка — ляцелі на адным крыле) гучыць. Хаця бясконцыя скандалы, прапагандысцкі бруд і Дразды вымагалі б яўна чагосьці грунтоўнейшага. А вось пакаяньня перад уласным народам — нават не канкрэтнага спавяданьня ў злачынствах (таптаньне закону, фальсыфікацыі, зьнікненьні, рэпрэсіі, русіфікацыя, прыніжэньне беларускай мовы й культуры, апраўданьне бальшавізму й г.д.), а хоць бы агульнага — «Даруйце, людзі!» — Беларусь дагэтуль так і не дачакалася.

«Адліга», паварот, эўрапеізацыя?

Ані.

Няма пакаяньня?

Ня веру.

А калі не зьбіраецца каяцца ўлада — перад Богам мусіць прасіць прабачэньня за грахі ўся нацыя. Беларусь без пакаяньня за злачынствы рэжыму асуджаная на паўтарэньне рабства ды хамства, хіба што ў розных формах. Самому беларускаму грамадзтву ёсьць у чым каяцца за апошнія 13 гадоў. Маўклівая згода зь беззаконьнем. Патураньне злу. Лянота. Абыякавасьць. Адчай. Збаўленьне ад раку дыктатуры нават не ў судох ды люстрацыях, а менавіта ў духоўнымператварэньні народу: «Бо смутак дзеля Бога прыносіць нязьменнае пакаяньне на збавеньне, а смутак зямны чыніць сьмерць» (II да Карынцянаў 7:10).

Узор усенароднага пакаяньня — другая палова 1940-х гадоў у Нямеччыне. «Ніколі больш!» — аднадушна вырашылі немцы пасьля жудасьцяў нацызму. Касьцёлы й кірхі былі перапоўненыя. Адраджэньне разгромленае краіны, фэномэн магутнае нямецкае хрысьціянскае дэмакратыі ды нават ідэя аб’яднаньня Эўропы — адтуль.

Нацыянальнае пакаяньне ў свой час перажывалі ангельцы ды італьянцы, палякі ды японцы. Хвалі пакаяньня (такога, як пасьля Вялікай дэпрэсіі або віетнамскай вайны) ад часу да часу пракочваюцца па ЗША — што прадвызначае духоўныя, а далей і палітычныя, эканамічныя й культурныя ўздымы Амэрыкі. Уся гісторыя народу ізраільскага, апісаная ў Старым Запавеце, — гэта чаргаваньне духоўных заняпадаў, народнага пакаяньня — і наступнага росквіту.

Але калі пачынаеш размаўляць зь беларусамі Сітна пра *пакаяньне*, сутыкаесься з насьцярожаным і знэрваваным неразуменьнем: «Каяцца?.. Нам?! А за што?..» Бязбожжа, эпідэмія «максімкі», недагледжаныя дзеці, развал гаспадаркі?.. Разводзяць рукі ў бокі: «Жысьць такая».

Не зьмяніўшы людзей, мы ня зьменім Беларусі. Сэнс пераменаў — не ў перабудове сыстэмы ўлады ці развароце замежна-палітычнай арыентацыі, а ў *перамене людзкіх сэрцаў*. У веры, любові, маральнасьці й адказнасьці, якія выплаўляюцца ў сьлязох пакаяньня.

Нацыянальнае пакаяньне — брама нацыянальнага абуджэньня.

*в.Малое Сітна*

— Ну што, раскайваемся? — намесьнік начальніка спэцкамэндатуры прымружыўся, узважыў на руцэ маю «Асабістую справу» з аркушыкам атэстацыі і агледзеў прысутных чальцоў камісіі.

## ХРОНІКА

### Дзяўчыну вэрбавалі

1 сакавіка студэнтцы Пэдунівэрсытэту Тацяне Ўсіновіч патэлефанавалі з КДБ і выклікалі на допыт. Студэнтка ў сваю чаргу зрабіла адзнаку ў пратаколе пра тое, што падчас гутаркі кадэбісты нецэнзурна лаяліся. На гэтым іхняя сустрэча і скончылася. Дагэтуль супрацоўнікі КДБ двойчы мелі размову зь дзяўчынай — 16 і 23 лютага. Падчас гутарак прадстаўнікі спэцслужбаў настойліва прасілі аказваць садзейнічаньне ў перадачы інфармацыі пра дзейнасьць «Маладога фронту» і Задзіночаньня беларускіх студэнтаў, а таксама абяцалі паспрыяць у разьмеркаваньні, паколькі сёлета Тацяна заканчвае вучобу.

### 2 сакавіка

### Пікет ля беларускага пасольства ў Кіеве

Ля будынку пасольства Беларусі ў Кіеве адбыўся пікет беларускіх жанчын, чые сваякі асуджаныя ў Беларусі па крымінальных, грамадзянскіх і маёмасных справах. Восем беларусак разгарнулі плякаты з патрабаваньнямі адстаўкі генэральнага пракурора і старшыні Вярхоўнага суду Беларусі, а таксама зь лёзунгам «Улада – гэта народ, а не службоўцы».

### Дашкевіча наведаў пасол АБСЭ

Кіраўнік місіі АБСЭ пасол Оке Пэтэрсан меў размову з палітвязьнем Зьмітром Дашкевічам у кабінэце кіраўніка шклоўскай папраўчай калёніі. Спадар Пэтэрсан запэўніў, што пра яго памятаюць і спадзяюцца на хуткае вызваленьне. Лідэр «Маладога фронту» Зьміцер Дашкевіч ужо паўгоду адбывае пакараньне за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі. Яшчэ год яму давядзецца правесьці за кратамі.

### Яшчэ адзін штраф за чарнігаўскую канфэрэнцыю

Аляксандар Дзенісенка атрымаў паведамленьне з суду Цэнтральнага раёну Гомеля, згодна зь якім яму неабходна ў 15-дзённы тэрмін аплаціць штраф. Калі ён вяртаўся 17 сьнежня з канфэрэнцыі «Саюзу левых сілаў» з Чарнігава праз памежны пераход «Новая Гута», увагу мытніка прыцягнулі кнігі «Аб кульце асобы Лукашэнкі», якія ляжалі на заднім сядзеньні аўтамабіля. Усяго было знойдзена і канфіскавана 17 асобнікаў. 8 лютага суд Цэнтральнага раёну Гомелю прыйшоў да высновы, што «інфармацыя, якая ўтрымліваецца ў друкаваных выданьнях, можа нанесьці шкоду палітычным інтарэсам і дзяржаўнай бясьпецы Рэспублікі Беларусь», і пастанавіў прыцягнуць Дзенісенку да адміністрацыйнай адказнасьці ў памеры 50 базавых велічынь за парушэньне ч.1 арт 193-9.

### Экс-кандыдаты ў абарону маладзёнаў

Са зваротам у сувязі з парушэньнямі правоў чалавека да старшыні Берасьцейскага аблсавету зьвярнуліся экс-кандыдаты ў дэпутаты аблсавету Уладзімір Малей, Сяргей Вакуленка і Уладзімір Вялічкін. Падстава: падчас студэнскай выбарчай кампаніі міліцыя затрымала групу маладзёнаў, якія трымалі ў руках па аркушу паперы, на кожным зь якіх было па адной літары. Затрыманыя былі адміністрацыйна пакараныя штрафамі ад 620 000 да 1 550 000 рублёў судзьдзёй Ленінскага раёну Берасьця. Экс-кандыдаты ў Берасьцейскі абласны Савет дэпутатаў лічаць, што санкцыі, выкарыстаныя супраць моладзі, надзвычай суровыя. Выканаць пастанову яны ня ў стане, бо зьяўляюцца навучэнцамі.

**Зьміцер Панкавец**

# Песенькі самотнага ліцьвіна. Зьніч надзеі.

P.L.A.N., БМА-груп, 2006.




Гэты дыск мог бы выйсьці на пачатку мінулага стагодзьдзя, калі б тады існавала музычная індустрыя.

Чарговы дыск старога блюзмэна, які намагаецца супернічаць у творчай плённасьці з Вайцюшкевічам. «Зьніч надзеі» паказвае Плясанава зь іншага боку. На рок-н-рол ён часова забыўся, каб запісаць альбом ціхенькіх і глыбокіх песень у суправаджэньні гітары, дуды, віялянчэлі ды яшчэ дзясятка інструмэнтаў. Гэты дыск мог бы выйсьці на пачатку мінулага стагодзьдзя, калі б тады існавала музычная індустрыя. Менавіта ў той час нас адсылае Плясанаў з напевамі «Знайдзі сябе, народ», «Краю! Я цябе люблю», «Тут месца ў краі аддадзена Богам». Сьпевы поўняцца сьвядомымі і несьвядомымі цытатамі з Купалы, Коласа, Багдановіча, Арсеньневай, Каганца. Арганічна тут глядзіцца і «Русалчын вэлюм» на словы Ларысы Геніюш. Але часам пераўзыходзяцца нават межы патрыятычнага патасу: «Калі станем людзьмі, пабудуем тут горад, назавем яго проста — Балаховічаўград», — пяецца ў песьні «Ўспамін пра будучыню». І ўсё ж такія песьні, як «Анна-Мар’я», «Зьніч надзеі» сьведчаць, што Плясанаўлірык куды мацнейшы і цікавейшы за Плясанава-змагара. Цешыць і тое, што музыка, якому ўжо шосты дзясятак, не спыняецца ў творчых пошуках. Да працы над гэтай праграмай ён прыцягнуў з тузін запрошаных музыкаў, сярод якіх Піт Паўлаў і дуэт «Аляксандра і Канстанцін». Абяцаюцца другая і трэцяя часткі праекту «Песенькі самотнага ліцьвіна». Дыск можна параіць сталым наведнікам літаратурна-музычных імпрэзаў у Доме літаратара ды ўсім прыхільнікам пранікнёных сьпеваў на кухні пра любоў і Радзіму.

# Трезвый расчёт

Пару рублей, Новая музыкальная компания, 2006.




Гурт як мінімум другасны.

Гурт «Пару рублей» — трэскі, што зьявіліся на хвалі папулярнасьці «Ляпіса Трубяцкога» і «Ленінграда». Бесклапотнасьць і вясёласьць, мажорныя акорды і духавая сэкцыя — такая канцэпцыя творчасьці. Але гэта яшчэ не рэцэпт папулярнасьці.

Гурт як мінімум другасны ў сваёй наіўнасьці, але што зробіш, калі душа пяе менавіта так: «Утром, как обычно, голова болит, в спине радикулит». Што трэба зрабіць, каб у хлопцаў усё было «о’кей»? Правільна — «даць пару рублей»! У параўнаньні з тымі ж знанымі калегамі іх тэксты меней правакацыйныя, а гумар больш рафінаваны.

Прадказальнасьць тэкстаў і другаснасьць музыкі кампэнсуюць душэўнасьцю: вось пачуеш «Я не магу інакш» і адразу чутна, што іхняе гэта, іхняе, а не перапеўка якая. «Пару рублей» не імкнуцца дагадзіць слухачу. Па жыцьці яны, відаць, такія — душэўныя некаиьюнктуршчыкі. Што цікава, у запісе кружэлкі ўзялі ўдзел музыкі з гуртоў «Žygimont VAZA» і IQ48, а запісваў Шлёма (Сяргей Лабандзіеўскі). Такое і адчуваньне складваецца пасьля праслуханага — сабраліся сур’ёзныя рабяты папрыкалвацца. І гэта ў іх атрымалася.

Музыка для невялічкіх пракураных клюбаў з багатым на напоі барам.

# Калыханкі

Зьміцер Вайцюшкевіч, дзіцячы фонд ААН Unisef, 2007.




Можна паставіць у шэраг адвечных разам з «Народным альбомам» ды «Сьвятым вечарам».

Дагэтуль беларускія бацькі пакутавалі ад нястачы запісаў дзіцячых калыханак, задавольваючыся нешматлікімі сьпевамі Паплаўскай, Данчыка і «Дзеда-Барадзеда».

Гэты дыск — падарунак усім нашым дзеткам ды іх бацькам — 12 калыханак на вершы Барадуліна, Камоцкага, Анемпадыстава, Драньaccount-Майсюка ў выкананьні Вайцюшкевіча, зорак беларускай тэлевізіі Ларысы Грыбалёвай і Тамары Лісіцкай ды Аляксандра Памідорава.

Сьпевы на любы густ, нават «Калыханка для дарослых» Касі Камоцкай ёсьць. Асабліва кранальная «Сьпі, мая кветачка», раскладзеная на жаночыя галасы. Памідораў разам зь «Minsker Kapelye» выконвае габрэйскую калыханку «Viglid». Дадаткам ідуць інструмэнтальныя вэрсіі дзьвюх калыханак, каб дзеткі ці іх бацькі маглі засьпяваць самі (тэксты на вокладцы прыкладаюцца).

Трохі ня ў тэму бонус ад групы «Нео»: іх песьня «Миллиарды звёзд» месьціцца тут, відаць, як напамін дзеткам: не забывайцеся, маўляў, на расейскую мову...

Праект «Калыханкі» можна паставіць у шэраг адвечных разам з «Народным альбомам» ды «Сьвятым вечарам» — такія песьні заўжды будуць актуальныя і запатрабаваныя, а сам дыск мае вытрымаць не адно перавыданьне.

Бацькі Беларусі патрабуюць: даеш працяг!

**Сяргей Будкін**

# Новая кніга Разанава

Паэт выдаў зборнік «Дождж: возера ў пункціры акупунктуры» —чацьвёрты ў сэрыі «Яйкаквадраты». У яго ўвайшлі як юнацкія творы, так і вершы апошніх гадоў, напісаныя ў Швайцарыі. Усе яны драбнюткія — чатыры-шэсьць радкоў.

**МБ**

# Новы нумар «Дзеяслова»

Паэзія Рыгора Барадуліна, проза Канстанціна Тарасава, Франца Сіўка, Юр'я Станкевіча, Уладзімера Сьцяпана, Ганны Кандрацюк, Дар'і Ліс. Паэтычныя пераклады Галіны Дубянецкай. Сканчэньне мэмуараў Ніла Гілевіча. Эсэ Сяргея Дубаўца «Стагодзьдзе НН».




POLSKIE RADIO
DLA ZAGRANICY

Хочаце пашырыць свой кругагляд?
Даведацца нешта новае й цікавае пра жыцьцё іншых людзей, Вашых суседзяў?
Жадаеце пачуць аб'ектыўную інфармацыю пра Беларусь?

Калі так — настройцеся на хвалю Беларускай службы Польскага Радыё для Замежжа (раней Радыё Палёнія).

Перадачы можаце слухаць кожны дзень пры дапамозе спадарожніка HOT BIRD **а 7.30, 16.30, 19.30 і 23.30** паводле беларускага часу.
Нашыя перадачы выходзяць у эфір на кароткіх хвалях **а 16.30 і 19.30** (частоты 6035, 6060 і 7180 кГц).

Радыёстанцыя **Baltic Waves** рэтрансьлюе дзьве гадзінныя перадачы **а 20.00** (1557 кГц) **і 24.00** (612 кГц), **Radio znad Wilii** (103,8 FM) — дзьве паўгадзінныя перадачы **а 5.30 і 23.30** мясцовага часу, а **Radio Lux** (107,5 FM ) — адну гадзінную перадачу **а 21.00**.

Нашыя выпускі ў жывым эфіры альбо асобныя рэпартажы й сюжэты ў запісе можна слухаць у рэальным часе ў Інтэрнэце й пры дапамозе фарматаў Real Audio і Windows Media. Запрашаем на наш сайт **www.polskieradio.pl/zagranica/by**




МАЛЯВАЎ ЛЯВОН ВОЛЬСКІ

# Вялікі дзякуй за ахвяраваньні

**С.Д., А.Г., Тацяне М., Валерыі Ч., Веры С., А.П., Аляксандру К., Т.Ш., М.Г., Алене Л., Сьвятлане Х., Аляксандру М., Ірыне Ц., Сяргею Ш., Т.В., Андрэю З., А.Р., Зьмітру Ш., Зьмітру Н., А.С., А.Л., Аляксандру К., А.С., Аляксандру С., Яўгеньні Я., В.С., Міхаілу Ж., Рыгору Р., Валер’ю З., Альберту С., В.Б., Марыі С., Андрэю Ф., Віктару К., Натальлі М., Марыі Б., Юр’ю М.** зь Менску.

**Мікалаю С.** з Ганцавічаў.

**Анатолю П.** з Жодзіна.

**Уладзімеру Т., А.П.** са Жлобіна.

**Мікалаю К.** з Чэрвеньскага раёну.

**Віктару Л.** з Калінкавіцкага раёну.

**Арцёму А., Г.Л., Сяргею К., Канстанціну П., Алегу М.** з Гомеля.

**Зьмітру Ж.** з Воршы.

**Іосіфу Дз.** з Гарадзенскага раёну.

**Галіне Г., Сяргею С.** з Барысава.

**Аляксею Ш.** з Камянецкага раёну.

**Леаніду Г.** з Гарадоцкага раёну.

**Мікалаю В.** з Пружанскага раёну.

**Паўлу С.** з Горацкага раёну.

**Р.** са Жлобінскага раёну.

**Алене Г.** зь Менскага раёну.

**Фаіне Г.** зь Віцебску.

**Уладзімеру М., Тацяне Р.** з Горадні.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3015 212 000 012** Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3015 212 000 012** Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

КВІТАНЦЫЯ

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газэту, дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні.**

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84; e-mail: dastauka@tut.by; паштовы адрас: а/с 537, 220050, Менск.

2) Просім кожную сям’ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 8000 рублёў на месяц. Гэтага хопіць на выхад і дастаўку газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перказу дакладна і разборліва пазначайце адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.** Тыя, хто перакажа 24000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад «НН» на 3 месяцы. Хто перакажа 48000 рублёў адразу, гарантуе публікацыю «НН» на паўгоду.

# Дэжавю

Працяг са старонкі 8.

Адама і Евы). І дзеячы апазыцыі кажуць, што разьлічваць у барацьбе з кіраўніком дзяржавы можна й трэба найперш на Маскву. Бакі апэлююць да Расеі як да найвышэйшага арбітра, «барина», які ўсіх «рассудит». Толькі кіраўнік пакрыўджаны і раззлаваны на свайго «сюзэрэна», які няправільна паводзіць сябе ў дачыненьні да васала, а апазыцыя спадзяецца на яго ласку. На практыцы дэманструецца прынцып «адзінства й барацьбы супрацьлегласьцяў» (Мао Цзэдун заклікаў разумець законы дыялектыкі літаральна: мужчына ёсьць процілегласьцю жанчыны, і ў выніку барацьбы «інь» і «янь» ды іх зьліцьця нараджаецца новае жыцьцё).

Нехта запярэчыць, што празьмерныя спадзевы на падтрымку Захаду («заграніца нам паможа!») ня лепшыя за спадзевы на дапамогу з Масквы.

Але паміж Усходам і Захадам ёсьць істотная розьніца.

З тактычных меркаваньняў апазыцыя мусіць шукаць хаўрусьнікаў і на Захадзе, і на Ўсходзе, весьці перамовы з кім і дзе толькі можна, калі гэта прынясе хаця б часовую карысьць. Але важна не губляць стратэгічных мэтаў і задач, бо інакш апазыцыя заўсёды будзе аморфным і безаблічным утварэньнем, у якога няма ні «інь», ні «янь».

Унутры гэтага ўтварэньня заўсёды будзе весьціся барацьба за лідэрства — то бок за права называцца галоўным змагаром за дэмакратыю. Бо адзінае, што надае хаця б вонкавую еднасьць апазыцыі, што служыць пакуль апраўданьнем яе існаваньня, — гэта змаганьне з уладай канкрэтнай асобы, якая, у сваю чаргу, ні за што ня хоча прызнаць апазыцыю, хоць і не зьнішчае яе дарэшты. «Анты-», паводле тае самае дыялектыкі, заўсёды мае на ўвазе нешта такое, без чаго яно ня можа існаваць. Абодва бакі маюць патрэбу адзін у адным, бо сілкуюцца ўзаемнай нянавісьцю.

## «Украіна — не Расея»

Расея не дапускае ніякай парадыгмы ў адносінах з былымі «нацыянальнымі ўскраінамі» — толькі поўнае падпарадкаваньне і безумоўнае прызнаньне вяршэнства Крамля на ўсёй постсавецкай прасторы. І ў гэтым істотнае адрозьненьне Расеі ад Захаду. Якія б інтарэсы ні перасьледавалі кіраўнікі асобных заходніх краінаў або карпарацыяў, Захад не патрабуе падпарадкаваньня яму — прынамсі, у традыцыйным разуменьні слова. Там дзейнічаюць правілы гульні, заснаваныя не на фэадальных парадках ці панятках «зоны».

Не патрабуе і не жадае той самы Эўразьвяз інкарпарацыі Беларусі. Калі б было інакш, ЭЗ даўно далучыў бы мірным шляхам Турэччыну, Сэрбію, Альбанію, Грузію і нават Украіну. Каб стаць часткай Зьвязу ці NATO, краіне, якая на гэта прэтэндуе, трэба хоць нешта сабой уяўляць. Быць нацыяй, а не транзытнай дзяржавай на мяжы Эўропы з Эўразіяй. Ня проста прызнаваць прынцыпы Рады Эўропы ды іншых эўраструктураў, але выпрацаваць бачаньне свайго шляху, свайго месца ў Эўропе.

Яшчэ да «аранжавай рэвалюцыі» прэзыдэнт Кучма, супраць уладараньня якога яна была скіраваная, напісаў кнігу «Ўкраіна — не Расея». І гэта сапраўды так, якой бы сьмешнай тая назва ні падавалася камусьці ў Маскве. Частка маскоўскай эліты ня можа і ня хоча гэтага разумець дагэтуль.

Але ЭЗ не сьпяшаецца даваць авансы цяперашняй Украіне, бо толькі ад рэальных крокаў яе кіраўніцтва ў эканоміцы і палітыцы, ад таго, за кім пойдзе на выбарах украінскі народ, а не ад Брусэлю з Вашынгтонам залежыць, ці стане гэтая дзяржава ў будучым часткай дэмакратычнай Эўропы.

Улада ў Беларусі працягвае, умоўна кажучы, пісаць калектыўны твор пад назвай «Беларусь застаецца Расеяй». Не з Расеяй, а менавіта Расеяй — у палітычным, сацыякультурным, гістарычным кантэкстах.

І апазыцыя, выглядае, пакуль ня вызначылася: пагаджацца зь ляялісцкім, нэасавецкім лёзунгам ці рабіць выгляд, што яна зь ім згодная, хоць унутрана гатовая ісьці на Захад. Але толькі каб родны электарат аб гэтым не здагадаўся.

## «Мы, беларусы, з братняю Русьсю...»

Налепкі з нацыянальным сьцягам, эмблемай ЭЗ і чырвона-зяленым флагам побач ёсьць яскравым прыкладам палітычнай шызафрэніі. Аб тым, якую моц могуць набываць падобныя ідэі, авалодаўшы масамі, можна было ўвачавідкі пераканацца яшчэ ў 1995-м, падчас рэфэрэндуму аб мове і сымболіцы. Апазыцыі застаецца выйсьці на плошчу з гімнам «Мы, беларусы, з братняю Русьсю».

Заклікі да нацыянальнай еднасьці могуць быць усур'ёз успрынятыя, толькі калі іх аўтары самі будуць дэманстраваць еднасць і пэўнасьць у тым, што іх справа заснаваная на праўдзе.

Калі ясна паставіць мэту — ісьці ў Эўропу, а не ў Расею, — яе можа падтрымаць значная частка грамадзтва. Наколькі значная — залежыць ад розных фактараў, у тым ліку ад здольнасьцяў і харызмы палітыкаў, эфэктыўнасьці штабоў, тактычнай гнуткасьці і г.д. Ваганьні ж, мімыкрыя, заляцаньні да Лукашэнкавага электарату — усё, чым пэрыядычна займалася апазыцыя апошнія пятнаццаці гадоў, — наўрад здольныя прыцягнуць пад нацыянальныя сьцягі новых прыхільнікаў. А адштурхнуць частку нацыянальна сьвядомай інтэлігенцыі і асабліва моладзь — могуць.

Часткі нацыянальнай апазыцыі таксама трэба адмовіцца ад старых стэрэатыпаў. Некаторыя яе прадстаўнікі кажуць — спачатку абаронім незалежнасьць, потым возьмемся за дэмакратыю. Айчына на першым месцы, правы чалавека — на другім. Гэтак праціўнікі дэмакратыі 15 гадоў таму цьвердзілі: спачатку — каўбаса, потым свабода. І не прыходзіла да галавы, што можа быць і адно і другое, што альтэрнатывай каўбасе свабода ня можа быць. Таксама як і каўбаса не замяняе свабоды.

Даўно насьпеў час зразумець і тое, што свабода і незалежнасьць ня ёсьць абстрактнымі тэрмінамі. Незалежнасьць Беларусі ад Расеі, гарантыі яе сувэрэнітэту палягаюць менавіта ў прынцыпах дэмакратыі і свабоды — тых самых, якія Эўразьвяз прапанаваў кіраўніцтву Беларусі ў якасьці асноватворных умоваў для супрацоўніцтва ва ўсіх сфэрах, у тым ліку для эканамічных прэфэрэнцыяў. Гаворка пра ўмовы самастойнага існаваньня, без пасярэдніцтва Крамля.

Чакаць дэмакратычных зьменаў, а значыць, і гарантыяў незалежнасьці з Расеі не даводзіцца. А шукаць «трэцяга шляху» — значыць гарантавана апынуцца сярод краінаў «трэцяга сьвету». А можа, мы гэты момант прапусьцілі?

# Лукашэнку чакае змрочная будучыня

Прэзыдэнт ня здолеў стварыць самадастатковай эканомікі і дзейсных дзяржаўных інстытуцыяў. Пры ім Беларусь выглядае як нежыцьцяздольная дзяржава. Піша аналітык радыё «Свабода» **Ян Максімюк.**

Лукашэнка ўзяў на сябе ролю «бацькі» для тых, хто страціў арыентацыю пасьля развалу Савецкага Саюзу. Здарылася так, што шчырая народная падтрымка, сілкаваная шчодрымі субсыдыямі з Расеі, дазволіла Лукашэнку пазьбегнуць якіх-кольвек значных эканамічных ці сацыяльных узрушэньняў за апошнія 12 гадоў.

Цяпер паток субсыдый перасыхае, і Лукашэнкаў савецкі стыль кіраўніцтва можа аказацца непрыдатным. Шквал супярэчлівых палітычных заяваў, якія ён зрабіў за апошні час, — і пра саюз з Украінай, і пра стварэньне саюзу энэрга-транзытных краінамі дзеля стварэньня процівагі расейскаму энэргетычнаму ціску — можа азначаць, што ягонае палітычнае чуцьцё таксама пачынае яго падводзіць.

Іншы фактар, які ўрочыць Лукашэнку змрочную будучыню, — гэта ягоная ізаляцыя ад беларускае кіраўнічае клясы. У студзені, у разгар энэргетычнае спрэчкі з Расеяй, Лукашэнка прызначыў свайго 31-гадовага сына Віктара ў Раду Бясьпекі, надаючы палітычнаму юніёру статус, роўны статусу кіраўніка КДБ ці міністра ўнутраных справаў.

Некаторыя аналітыкі меркавалі, што Лукашэнка рыхтуе свайго сына ў пераемнікі. Але прычына такога прызначэньня насамрэч можа быць нашмат прасьцейшай — самотнаму прэзыдэнту бракуе кваліфікаваных і вартых даверу кандыдатаў на галоўныя дзяржаўныя пасады на замену зношаным і стомленым палітычным вэтэранам адміністрацыі.

Яшчэ адзін дзіўны ход быў зроблены ў лістападзе 2006 г. У інтэрвію групе ўкраінскіх журналістаў у Менску Лукашэнка раптам высунуў ідэю стварэньня беларуска-ўкраінскага саюзу — матывуючы гэта тым, што такі саюз будзе мець болей шанцаў на посьпех у параўнаньні з млявым расейска-беларускім саюзам.

Лукашэнка ясна прадчуваў непрыемнасьці, якія чакалі яго. У чаканьні праблемаў з расейскімі энэрганосьбітамі ён вырашыў даслаць сыгнал украінскаму прэзыдэнту Віктару Юшчанку — які і сам ведае, што такое расейская энэргапалітыка, — што прысьпеў час пайсьці на перамовы. Можна сабе ўявіць, што празаходні прэзыдэнт Юшчанка быў настолькі ж уражаны гэтай прапановай, як і ўкраінскія журналісты ў Менску.

У студзеньскім інтэрвію нямецкай газэце Die Welt Лукашэнка выказаў ідэю, што Беларусь гатовая стаць «удзячным вучнем» Захаду, і што ён асабіста бачыць Беларусь на шляху Нямеччыны ці Швэцыі. Аднак ягоныя камэнтары аказаліся ўсяго толькі мімалётнай спробай замірэньня з Захадам. Праз тыдзень, на сустрэчы зь лідэрам Камуністычнай партыі Расейскай Фэдэрацыі Генадзем Зюганавым, ён вяртаецца на колы свае — запэўніваючы, што Беларусь і надалей будзе «фарпостам» Расеі на Захадзе.

Ягонае нядаўняе інтэрвію агенцтву Reuters сьведчыць, што ён нават і не спрабуе ні з кім сябраваць. У сваёй клясычнай манеры ён заявіў, што Беларусь выжыве і без Эўропы, і без Расеі.

Зьменлівасьць публічных заяваў прэзыдэнта робіць немагчымай іх літаральную інтэрпрэтацыю. Бессэнсоўна цешыць сябе надзеямі на аснове таго, што ён недзе некаму сказаў. Калі толькі Лукашэнку не прыцісьне эканамічная неабходнасьць, нікуды ён свой народ не павядзе — ні ў Швэцыю, ні ў Расею.

Лукашэнку не скіруеш на дэмакратычны шлях не таму, што ён такі прагнікліві, а таму што ён такі абмежаваны ў сваіх бачаньнях. Прэзыдэнт добра ўсьведамляе сваю ролю ў Беларусі — ён кармілец, які старанна адсочвае патрэбы простых людзей, і жорстка карае тых, хто наносіць народу шкоду. Лукашэнку цяжка ўявіць Беларусь без Лукашэнкі. Лукашэнку цяжка ўявіць такі сьвет, дзе людзі адчуваюць сябе інакш.

Выбары ў Беларусі — як звычайна раскрытыкаваныя назіральнікамі — ператвораныя ў спэктакль, сымуляцыю дэмакратыі. А Лукашэнка, здаецца, шчыра перакананы, што менавіта гэта людзям і трэба. «Як можа нармальны, разважны, прыстойны чалавек — я ўжо казаў гэта назіральнікам за выбарамі — казаць, што выбарчы працэс быў недэмакратычны? З выбараў мы зрабілі сьвята, — заявіў прэзыдэнт пасьля выбараў 2006 году, зь якіх пачаўся ягоны трэці тэрмін і якія былі далёка ня сьвятам для апазыцыі. — А ведаеце, чаму я так зрабіў? Таму што на выбарчыя ўчасткі прыходзіў мой народ, які так нечакана і ашаламляльна падтрымаў мяне, калі я толькі пачынаў займацца палітыкай, вы памятаеце, 10 гадоў таму. І я зраблю ўсё магчымае, каб гэтыя людзі мелі болей такіх сьвятаў».

Можа, Лукашэнка і не памыляецца, кажучы, што для «ягонага народу» выбары і рэфэрэндумы былі «сьвятамі». У дзень выбараў на выбарчых участках прадаюцца гарэлка, кілбасы і іншыя прадукты па зьніжаных цэнах, і людзі гэтым карыстаюцца. Пакуль ёсьць за што зьніжаць цэны, сьвята можа працягвацца.

Але некаторыя выгоды — і гіганцкія нафтавыя ды газавыя субсыдыі ў тым ліку — пачынаюць паціху зьнікаць. Ці ня скончыцца і сьвята, калі беларусаў прымусяць за ўсё, што яны бяруць са зьніжкамі, плаціць па поўнай праграме?

Па сутнасьці Лукашэнка ня здолеў стварыць самадастатковай эканомікі і дзейсных дзяржаўных інстытуцыяў. Пры ім Беларусь выглядае як нежыцьцяздольная дзяржава. Ягоная дзіўная заява пра фальсыфікацыю выбараў’2006 дзеля таго, каб дадаць апазыцыі хоць колькі галасоў, выяўляе ягоны глыбокі палітычны правал.

«Так, мы сфальсыфікавалі папярэднія выбары. І я ўжо казаў Захаду пра гэта, — апавядаў ён украінскім журналістам у Менску 23 лістапада. — За прэзыдэнта Лукашэнку прагаласавалі 93,5 %. Але кажуць, што гэтая лічба неэўрапейская. Таму мы зрабілі 86 %. Гэта праўда. Калі б мы цяпер пачалі перападлік бюлетэняў, то ня ведаю, што б мы зь імі рабілі. Эўрапейцы нам перад выбарамі сказалі, што, калі выніковыя лічбы будуць прыблізна эўрапейскія, то яны прызнаюць нашы выбары. Таму мы паспрабавалі зрабіць эўрапейскія лічбы».

Зрабіць з выбараў «эўравыбары» Лукашэнку як раз плюнуць. Зрабіць Беларусь эўрапейскай краінай ён ня здольны.

# ЗША супраць Ірану: вайна можа мець нечаканы вынік

Канфлікт можа выбухнуць нечакана, а яго вынікі прывядуць да карэнных зьменаў у сьвеце. Піша **Сяргей Богдан.**

Даклад Міжнароднай агенцыі па атамнай энэргіі аб намаганьнях Ірану па ўзбагачэньні ўрану амэрыканскае кіраўніцтва выкарыстала, каб заклікаць да ўвядзеньня больш жорсткіх санкцыяў у дачыненьні да гэтае краіны. Супрацьстаяньне Ірану і Амэрыкі абвастраецца. ЗША дасылаюць у раён Пэрсыдзкай затокі новыя войскі, на адрас Тэгерану гучаць абвінавачаньні ва ўмяшаньні ў ірацкія справы. Тэгеран адказвае разгортваньнем шматмільённых праграмаў дапамогі Іраку, дражніць амэрыканскія караблі ля сваіх берагоў дый ладзіць выпрабаваньні ракетнай тэхнікі і манэўры. Эўрапейскія краіны пагаджаюцца з амэрыканскімі патрабаваньнямі аб нефармальным абмежаваньні эканамічных адносінаў зь Іранам.

## Чаму вайна можа выбухнуць нечакана?

Вядома, грамадзкая думка ў сьвеце і ў Амэрыцы не гатовая да гвалтоўнага сутыкненьня Амэрыкі і Ірану, а абгрунтаваць сілавыя дзеяньні супраць Тэгерану ААНаўскімі рэзалюцыямі ЗША ў бліжэйшы час ня змогуць. Але ваеннае сутыкненьне, на думку стэнфардзкага палітоляга Абаса Мілані, можа адбыцца зусім неўзабаве.

Па-першае, насамрэч замежнапалітычныя рашэньні часьцяком прымаюцца насуперак грамадзкай думцы вузкім колам нават не спэцыялістаў, а проста далучаных да ўлады людзей. А яны могуць кіравацца далёкімі ад жыцьця ўяўленьнямі ці перасьледаваць сваю прагматычную ці ідэалістычную праграму.

Прыхільнікі амэрыканскага ўварваньня ў Іран перакананыя, што ўжо самое ўмацаваньне амэрыканскае прысутнасьці ў ваколіцах Ірану надоечы падштурхнула іранскі рэжым да прымірэнчых крокаў — што дыпляматы не зрабілі за гады, пара караблёў зрабіла за некалькі тыдняў. Маўляў, тамтэйшы рэжым хістаецца на гліняных нагах і разваліцца ад першага ваеннага штуршка. А мо' і проста капітулюе, калі працягваць нарошчваць вайсковы ціск.

Па-другое, пры нарошчваньні амэрыканскай прысутнасьці вакол Ірану і імкненьні абедзьвюх краінаў прадэманстраваць адна адной свае сілы ўзьнікае пагроза выпадковай вайны, якая разьвяжацца сама сабой, напрыклад, з-за непаразуменьня. Альбо ў выніку правакацыі, зробленай невялікай групай індактрынаваных ваяўнічымі ідэямі вайскоўцаў з таго ці іншага боку — як ужо было з «Танкінскім інцыдэнтам», што стаў пачаткам віетнамскае вайны. Тады, у 1964 г., у абстаноўцы напружанага процістаяньня сілаў камуністычнага Ханою і Вашынгтону ў Танкінскай затоцы для пачатку вайны было дастаткова паведамленьня пра напад катэраў камуністычнага Віетнаму на амэрыканскія караблі. І няважна, што пазьней сэнацкае расьсьледаваньне абвергла праўдзівасьць гэнага нападу.



**Амэрыканскія вайсковыя базы вакол Іраку.**

Разумеючы, што з павелічэньнем колькасьці амэрыканскіх караблёў і вайсковых аддзелаў у ваколіцах Ірану расьце верагоднасьць выпадковых сутыкненьняў, апанэнты ўварваньня крытыкуюць гэтую палітыку. Да таго ж, дасылка новых сілаў выклікае падозраньні наконт існаваньня гатовых плянаў уварваньня. Новыя пляны бясьпекі ў Іраку могуць дапамагчы схаваць перагрупоўку сілаў напярэдадні ўварваньня ў суседнюю краіну. Краіне, што ўжо ваюе, лягчэй схаваць свае пляны новых войнаў у хаосе тых войнаў, якія яна ўжо вядзе. Мірная краіна не патрапіць незаўважна правесьці пераўзбраеньне, мабілізацыю, вышкал, перагрупоўку і высоўваньне на баявыя пазыцыі, не прыцягнуўшы да сябе ўвагі. Таму вайна ў Іраку можа быць як адмоўным, так і дадатным чыньнікам у падрыхтоўцы Вашынгтонам вайны з іранскім рэжымам.

А бойні ў Багдадзе зусім не абавязкова будуць замінаць уварваньню ў яшчэ адну краіну. Па-першае, на значнай частцы тэрыторыі краіны хаосу няма — у курдзкіх правінцыях, а на поўдні ён мае абмежаваны характар, да таго ж новыя шыіцкія палітычныя эліты ў прынцыпе хутка могуць забясьпечыць у краіне адносную цішыню, усталяваўшы крывавую дыктатуру. Па-другое, нясконченыя аўганскія справы не перашкодзілі ЗША пачаць кампа-

ню супраць Садама, а цяпер яшчэ і разгарнуць барацьбу з самалійскімі ісламістамі. Ступень рацыянальнасьці палітыкі вайсковага ўмяшаньня ва ўсё новыя і новыя краіны зьмяняецца ў залежнасьці ад тых мерак, якімі вы яе ацэньваеце.

## Чаму ЗША могуць не перамагчы ў Іране?

Нягледзячы на сьмеласьць амэрыканскіх пляноў дэмакратызацыі Блізкага Ўсходу і майстэрскае выкарыстаньне наяўных сілаў, магчымасьці Вашынгтону ў вайсковым пляне застаюцца абмежаванымі, дзеля чаго ў сярэдзіне сьнежня прэзыдэнт Буш і абнародаваў пляны павелічэньня колькасьці амэрыканскага войска. Праўда, дзеля разгортваньня новых сілаў патрэбныя многія гады — на фармаваньне частак, камплектацыю афіцэрамі і спэцыялістамі і г.д. А вайна ідзе ўжо сёньня.

Пасьля Іраку амэрыканцам ужо не даводзіцца спадзявацца на эўрапейскіх хаўрусьнікаў. Эфэктыўнасьць арабскіх сяброў Амэрыкі заўжды была невысокай, як выразна паказала ірацка-іранская вайна 1980-х гадоў, калі ўвесь арабскі і заходні сьвет дапамагаў марным спробам Садама адолець ізаляваны ад усяго сьвету рэвалюцыйны Тэгеран. Таму ў сутыкненьні зь Іранам разьлічваць амэрыканцам варта толькі на сябе.

Іран у разы большы за Ірак ці Аўганістан. У краіне хапае незадаволеных тамтэйшым рэжымам, але калі яшчэ гадоў пяць таму гэтая незадаволенасьць зборльшага была зьвязаная з жаданьнем пабачыць «Буша-вызваліцеля», дык цяпер расьце скептыцызм наконт здольнасьці амэрыканцаў гвалтоўным шляхам ажыцьцявіць чаканыя пераўтварэньні таксама і ў Іране.

Гэта зьвязана акурат зь вельмі непрывабнай карцінкай ірацкіх падзеяў. Ірак у іранскай палітыцы чымсьці нагадвае Беларусь у расейскай. Маскоўскім палітыкам цяжка зьмірыцца зь незалежнасьцю Беларусі, а многія іранскія кіраўнікі доўга яшчэ будуць ставіцца да «таксама шыіцкага» Іраку як да «блізкага замежжа». Ірак, што існуе як асобная краіна толькі з 1930-х гадоў, заўжды меў як цесныя сувязі зь Іранам, так і доўгую гісторыю канфліктаў ды нянавісьці. Шыіцкае насельніцтва абедзьвюх краінаў вольна вандравала паміж краінамі да прошчаў, дэкляруючы сваё братэрства, каб пасьля страляць адзін у аднаго падчас шматгадовай вайны. Ірак адасобіўся граніцай толькі калі да ўлады ў Багдадзе прыйшоў Садам, які ўпершыню ў гісторыі паставіў кардон на мяжы з Іранам, надзейна яго замінаваўшы.

Калі амэрыканскі полюс аслабне, у многіх узьнікне спакуса перадзяліць сьвет.

Паводле гістарычных мерак гэта было нядаўна. Таму нават іранскія апазыцыянэры чуйна рэагуюць на разьню ў Багдадзе. І ня хочуць такога разьвіцьця падзеяў у сваёй краіне. Цягам мінулых некалькіх гадоў Амэрыка страціла аўтарытэт сярод праціўнікаў іранскага рэжыму, якія чакалі ўсталяваньня ў суседнім і такім блізкім Іраку дэмакратычнай рэспублікі — правобразу сваіх мараў аб будучыні Ірану, а атрымалі жахлівую карціну грамадзянскай вайны.

Так амэрыканскія жаўнеры страцілі галоўнага хаўрусьніка, які гарантаваў ім перамогу — апазыцыйна настроенае насельніцтва. Іранскі рэжым цяпер можа выстаяць, бо дзяржаўны лад гасіць многія праявы незадаволенасьці, пакідаючы прастор для канкурэнцыйнай палітыкі, а краіна ня надта гладка, але самастойна разьвіваецца. Прыбыткі ад продажу нафты далі Тэгерану добрыя нафтавыя грошы, каб разбудаваць ладны абарончы патэнцыял, а таксама дамагчыся значнага ўплыву ў рэгіёне і сьвеце. Зрэшты, як паказваюць падзеі ў Іраку, Іран захаваў свой патэнцыял і ў галіне асымэтрычнай, партызанскай вайны.



**Атамныя аб’екты Ірану.**

Таму ўварваньне ў Іран для ЗША вельмі рызыкоўная прыгода. Выдаткаваўшы значныя рэсурсы і не дасягнуўшы істотных посьпехаў, ці яшчэ горш — пацярпеўшы паразу, ЗША страцяць свае пазыцыі ў рэгіёне Блізкага Ўсходу, што мае ключавое значэньне дзеля амэрыканскае палітыкі ва ўсім сьвеце. Блізкі Ўсход пяройдзе пад яшчэ мацнейшы іранскі ўплыў.

Нехта скажа, ЗША хутка ачомаліся ад паразы ў віетнамскай вайне, таму нават магчымая няўдача зь Іранам можа быць часовым адступленьнем. Але параўноўваць гэтыя выпадкі нельга. Страціўшы пасьля віетнамскай вайны Індакітай, ЗША страцілі аграрныя краіны, багатыя на бамбук. Пацярпеўшы паразу ў Іране, Вашынгтон страціць кантроль над значнай часткай жыцьцёва важных і ўсё меншых запасаў энэрганосьбітаў.

І яшчэ, віетнамская параза мела месца ва ўмовах двухпалярнага сьвету, які стабілізаваў любыя падзеі. Існавалі такія сабе два полюсы, і калі якая краіна адыходзіла ад аднаго полюсу, дык ёй трэба было альбо трымацца сярэдзіны альбо прыляпіцца да процілеглага полюсу. Свайго полюсу яна не стварала. Але пасьля таго, як полюс застаўся толькі адзін, сытуацыя зьмянілася, і нават Кітай ды Расея былі пакуль вельмі асьцярожныя з сваімі амбіцыямі стварацьуласныя полюсы. Калі амэрыканскі полюс аслабне, у многіх дзяржаў узьнікне спакуса і магчымасьці самім стаць гэтымі «магнітамі» і перадзяліць сьвет. Тады канфрантацыя набудзе глябальны размах.

# Мова беларускага радыё

Жах і сорам. Піша **Янка Саламевіч**.

Калі я ляжаў у больніцы, на вялікае зьдзіўленьне (як такое прапусьцілі?!) пачуў па радыё словы настаўніцы з Камянецкага раёну: «Раней я казала сваім вучням: «Слухайце беларускае радыё. Там самая чыстая беларуская літаратурная мова». Цяпер кажу ім: «Ні ў якім разе ня слухайце беларускага радыё. Чаму вы там навучыцеся?! Там суцэльная непісьменнасьць: і ў скланеньні, і ў спражэньні, і ў націсках, і ў плойме русізмаў, якія дыктары-вядоўцы сёньня «ляпаюць» у эфір, ня думаючы нават, што пра іх непісьменнасьць падумаюць тыя, хто мову добра ведае, зусім ня думаючы, што гэтым самым абражаюць, крыўдзяць слых сваіх слухачоў, тых, хто адбірае, слухае іхнюю непісьменную мову». Дальбог, яна мела абсалютную рацыю. Чаго толькі ні пачуеш на нашым беларускім радыё, у жывым эфіры, дзе да перадач амаль ніхто не рыхтуецца, як гэта рабілі ранейшыя дыктары.

Расейцы, французы і іншыя народы, якія сябе паважаюць, абараняюць чысьціню сваёй мовы на дзяржаўным узроўні. Прымаюць нават законы, якія дапамагаюць іхняй мове жыць паўнакроўна.

У нас таксама ёсьць «Закон аб мове». Але яго ніхто не выконвае. Наадварот, у нас на дзяржаўным узроўні ўведзенае такое глупства, як дзьвюхмоўе. Кожны павінен валодаць і расейскай, і беларускай мовамі. А што атрымліваецца папраўдзе?

Пераважная большасьць дыктараў нашага радыё ўжо ня могуць вымаўляць *дз*, цьвёрдыя *ц* і *ч* — самыя характэрныя гукі беларускай мовы (успомніце нашага народнага паэта Пімена Панчанку, ягоныя «звонкае «дзе» і густое «чаго»!). Большасьць жа сёньняшніх дыктараў (яны пераважна «мінчане») гавораць: шшаслівы, деті, удельнікі, багаттяў, двацать, прыгажость і нават вошы (замест вочы!).

У Расеі або Польшчы таго, хто так вымаўляе гукі мовы, на якой трэба весьці перадачу, на гарматны стрэл не падпусьцілі б да мікрафону. У нас жа ўсё можна.

Успамінаю, як у 1961—1962 г., прайшоўшы тры этапы конкурсу, мы гадзінамі пад кіраўніцтвам Тамары Старасьценкі паўтаралі: «Дзе цётчыному дзядзьку дзецца?», «Ці лілі алей у бульбу?».

Уяўляеце, каб Янка Купала пачуў, што ягоны «Курган» чытаюць: «Дрэмле памятка дён, Што ў нябыт утяклі: Удірванелы курган (з *г* выбухным) векавешны». Якая была б ягоная рэакцыя? А на нашым радыё так чытаюць Купалавы творы артысты з Расейскага тэатру. Ня іхняя гэта віна, што ў іх так сфармаваны артыкуляцыйны апарат, зусім іншая рэч, што іх акурат запрашаюць чытаць клясыку беларускай літаратуры найчасьцей некваліфікаваныя кіраўнікі і рэдактары.

Націскі. Многія з тых, хто вядзе перадачы на радыё, ня ведаюць значэньня слова, ня ведаюць, куды ставіць націск у ім. Таму чую па радыё: ры́кае (рыка́е), каме́нь (ка́мень), ката́лаг (каталог), правадзі́ць (праводзіць), чаравікі́ (чараві́кі), сабралі́ (сабра́лі), пра бусла́ (пра бу́сла), вусы́ (ву́сы), нават нане́с (трэба нанёс, але расейцы ня ставілі над *ё* кропак (цяпер ужо ставяць), таму «зь ліста» дыктары чытаюць без падрыхтоўкі такое глупства, інакш яго не назавеш), шша́сьліва (шчасьлі́ва), заглянýць (загля́нуць), пры́нята (пры-ня́та), паклапаці́мся (паклапоцімся) і тысячы іншых прыкладаў. Тут дыктарам «дапамагаюць» «грамацеі»-рэдактары, якія рыхтуюць тэксты.

Праходзіць нязьмерная колькасьць русізмаў. Пачуў: вапіць сырэна (лямантуе), няштатны (пазаштатны), ярмарка (кірмаш), будзь то аматарскі (па-беларуску: ці, ці; або, або), менш месяца (менш за месяц), старая сабака (па-беларуску: стары сабака), суправаждаецца (суправаджаецца), тры шляха (тры шляхі), у палітыкі (у палітыцы), тронула песьня (кранула), застацца ў руля (за рулём), забівацца (у сэнсе хавацца куды-небудзь), узьняць затанулы карабель (падняць), два ручая (два ручаі), завінавацілі (сталі вінаватыя, павінны) — такое часта чуеш і па тэлевізары, прынесьці прабачэньні (па-беларуску просяць прабачэньня), палутара (паўтара), навучная (навуковая), збор хлеба (па-беларуску — збожжа, збажыны), па законам (па законах), закупае (закупляе), чудак (па-беларуску дзівак), далі Курбека (Курбеку), кнігі не падобныя сучасным (да сучасных), памятнікі архітэктуры (помнікі), стакан (шклянка), карманныя расходы (кішэнныя), страда (гарачая пара, уборачная), сарочка (кашуля, бо сарочка ў беларусаў — сподняе адзеньне).

Чыноўнікі, нягледзячы на дзьвюхмоўе, якое замацавана ў Канстытуцыі, гавораць усе (на сто працэнтаў!) па-расейску, ігнаруючы нейкую там беларускую мову. Нават супрацоўнікі Міністэрства асьветы на чале зь міністрам. Вядоўцы, выгінаючы па-рабску перад імі сьпіны, ні каліўца не саромеючыся, не вядуць за сабою, а адразу пераходзяць на расейскую мову. Таму і радыё атрымліваецца не беларускае, а нейкае арэнбурскае, самарскае. Дайшлі ўжо да таго, што вясковых бабулек прымушаюць гаварыць на «трасянцы».

Тое самае і з большасьцю артыстаў сталічных беларускіх тэатраў, якія пераважна не валодаюць сваім асноўным інструмэнтам — моваю, а словы роляў, як папугаі, паўтараюць са сцэны па-беларуску, пераважна таму і ня могуць імправізаваць на беларускай мове. Тое самае з удзельнікамі розных гуртоў, асабліва сьпевакамі, музыкантамі, танцорамі і г.д. Дайшло ўжо да таго, што, скажам, сьпявачкі-даяркі з Чэрвеншчыны даюць інтэрвію на вельмі дрэннай расейскай мове. Дзе ім ведаць беларускую літаратурную мову, калі яе слаба вывучаюць у большасьці вясковых школ, ня кажучы ўжо пра горад, ВНУ? А самому навучыцца мове ня так проста, калі дзяржаўная палітыка вядзе да русіфікацыі.

Колькі б ні пісалі і Я.Скрыган, і В.Рабкевіч, і іншыя, што па-беларуску гаварыць і пісаць *у першы (дзявяты) раз* (па-расейску — в первый (девятый) раз) — непісьменна. Навошта тут гэтае *ў*? Трэба гаварыць і



УЛАДЗІМЕР КАЗАНЕЎСКІ. «КРЫТЫКА»

пісаць першы раз, прэмія 10 тысяч рублёў (а не *ў* 10 тысяч рублёў), *за* 20 кілямэтраў (а не *ў* 20 кілямэтрах). Але хто чытае, як трэба правільна гаварыць і пісаць з супрацоўнікаў цяперашняга радыё?

Фразэалёгія — адметнасьць кожнай мовы. Найчасьцей фразэалягізмы не перакладаюцца на другую мову. Трэба шукаць найбольш выразныя адпаведнікі. А на радыё, дзе галоўны перакладчык рэдактар, а то і машыністка, якія ў побыце не карыстаюцца беларускай моваю, фразэалягізмы пераважна калькуюцца. Нават такі вопытны пісьменьнік, як І.Шамякін, пісаў: морда просіць цагліны. Гэта самая ардынарная калька з расейскага «морда просит кирпича». Як нясмачна, а галоўнае — непісьменна, не перадае зьместу зьявы. У народзе, чутае на Палесьсі, кажуць: морда як альховы пень. Лягічна абсалютна. Калі алешыну сьпілоўваюць, пень яе становіцца чырвоны. Ці «улитка едет — когда-то будет». Чуў: сьлімак паўзе — пачанку вязе. «Не до жиру — быть бы живу!» у народзе пераклалі: не да тлушчу — зьесьці б гушчу. Дык не калькуйце, а шукайце!

Слова «жанцы» дыктары часта вымаўляюць як «жняцы». Але ж яшчэ ў народнай песьні было: «Жэнчыкі (ня жнечыкі!) маладыя, у іх сярпы залатыя». Трэба такое запамінаць на ўсё жыцьцё.

Слова «ўласны» зацягана на нашым радыё да немажлівасьці: уласныя думкі, уласная работа, на ўласныя вочы (хоць у народзе гавораць: на свае вочы) і г.д.

Паўгады. Ніводзін беларускі слоўнік не дае гэтага непісьменнага слова-калекі. Радыё ж выкарыстоўвае. На вялікі жаль, ім карыстаецца тойсёй і ў друку. І ніхто не паправіць! Год — назоўнік мужчынскага роду. Чаму ў родным склоне чаго? Году. Палова яго — паўгоду. У любым родзе — мужчынскім, жаночым, ніякім.

Вельмі часта ў эфір ідуць формы і словы, як яны напісаныя ў тэксьце, а ня так, як трэба вымаўляць па-беларуску, паводле характэрнай беларускай артаэпіі: свята (сьвята), песня (песьня), снег (сьнег), выданне (выданьне) і г.д. Гэта ведае кожны вучань, а супрацоўнікі радыё ігнаруюць настойліва. Як вымаўляюць беларускія словы, паказана ў «Слоўніку беларускай мовы» пад рэдакцыяй акадэміка М.Бірылы, у працах прафэсара Ф.Янкоўскага і інш. Такія слоўнікі павінны быць на радыё ў кожнага пад рукою. Выйшлі яны, праўда, ужо даўнавата.

Рэкляму перадаюць толькі па-расейску. Гэта яшчэ адна з крыніц русіфікацыі беларускага радыё. Быццам беларусы такія няздары, што рэклямы на роднай мове не зразумеюць. Для каго ж тады яна? Для замежжа? І сьмешна перад гэтым часта чуць, што радыё хоча гаварыць «шчыра, шчодра, па-беларуску». Гэта ж, пагадзіцеся, чыстай вады дэмагогія, фальш, хлусьня ў вочы, дакладней, у вушы.

Дзе з усяго сказанага вышэй выйсьце? Трэба вучыцца. Часьцей заглядаць у слоўнікі. Выдаецца іх нямала. Пераймаць тых, хто добра валодае жывой, паточнай мовай, як, напрыклад, міліцэйскі работнік Віктар Бабей. Ах, як ён натуральна, прыгожа гаворыць. Многія гора-дыктары могуць яму пазайздросьціць.

Трэба працаваць над складаньнем радыёпраграм, што апошнім часам чамусьці зусім забыта. Чаму ігнаруецца беларуская літаратура, якая мае творы ня толькі эўрапейскага, але і сусьветнага ўзроўню? Дзе перадачы «Тэатар перад мікрафонам», канцэрты на заяўкі слухачоў, фэстывалі гумару накшталт аўцюкоўскага ды многае іншае? Ці даўно вы чулі канцэрт Ф.Шаляпіна, М.Забэйды-Суміцкага, Л.Русланавай, А.Александроўскай, казкі для дзяцей у выкананьні Г.Глебава, Л.Ржэцкай, «Паўлінку» з карыфэямі сцэны Г.Глебавым і У.Дзядзюшкам, «Навальніцу» А.Астроўскага з удзелам М.Савінай, В.Далматава, Г.Фядотава, А.Яблачкінай, п’есы Горкага, ігру геніяльнага Б.Платонава ў творах К.Крапівы, А.Макаёнка, Янкі Купалы і многае іншае. Шлягеры, папсу круціць гадзінамі найлягчэй.

Адным словам, патрабуюць сур’ёзнага кантролю нашы радыёжурналісты, дыктары, рэдактары. На радыё гэта ня робіцца. Прынамсі, такое адчуваньне. Начальства, кіраўніцтва там такое, якое беларускаю моваю не карыстаецца, ня ведае яе і ведаць ня хоча. А «по долгу службы» і пасады абавязана. Яму добры і брудны эфір. Такога мы, радыёслухачы, ня хочам слухаць. Вучоба акурат і дасьць мажлівасьць рабіць перадачы больш цікавымі, больш пісьменнымі, беларускімі, мілагучнымі, больш разнастайнымі, як гэта было ў часы, калі радыёкамітэтам кіраваў Генадзь Бураўкін. Час ужо настаў даўно.

**Ад Рэдакцыі.** На радыё амаль не пачуеш беларускамоўных людзей. Ці пусьцяць на радыё Арлова, Бураўкіна, Мілінкевіча, Пазьняка, Радзіма Гарэцкага, Лявона Вольскага? Спадар Саламевіч ставіць дыягназ, але не канстатуе прычыну хваробы. Зробім гэта мы за яго. У большасьць рэдакцый радыё, як і на БТ, падбіраюць людзей ня столькі паводле прафэсійных якасьцяў, абы былі «ідэалягічна верныя». Такіх, якія ні слова крамолы не падпусьцяць. А мова ім — як сабаку пятая нага. Пакідаюць яе для прыліку, каб добры наш народ не перастаў лічыць гэтую ўладу беларускай.

Дзе ж выйсьце? Тут, нябожа, вучэньне не паможа, тут іншае...

# У пекле Азіі

Рэпартаж з Аўганістану нашага суайчыньніка **Аляксея Лявончыка**.

**Працяг. Пачатак у №4-7.**

## Раньнія чыгункі

Нават у тых краінах, дзе адвеку жывуць розныя этнасы, заўжды існуе напруга між імі, і часьцяком аднаму з этнасаў выпадае роля «ахвярнага казла». Нэгры ў ЗША, хазоры ў Аўганістане, каўказцы ў Расеі. Мусульмане зь індусамі жылі ў міры да XIX ст. У XX ст. падзел Індыі на Пакістан ды ўласна Індыю прывёў да тысячаў ахвяраў. У Расеі ўздымаецца хваля гвалту супраць цёмнаскурых, не праходзіць і дня, каб не было паведамленьняў, што нехта з «хуліганцкіх памкненьняў» моцна «зьбіў манціроўкамі» няшчаснага эмігранта. Расейцы лічылі беларусаў ды ўкраінцаў «меншымі братамі», тым самым праграмуючы сабе ролю таго боку, за якім паўсюдна мусіць заставацца апошняе слова.

Мяркую, да прыняцьця іншых культур схільныя ды здольныя далёка ня ўсе. Ёсьць абмежаваная колькасьць людзей, якая праз сваю адукаванасьць, падарожжы ці ўзгадаваньне здольныя прымаць людзей такімі, якія яны ёсьць, прымаючы ўсе дзівацтвы *іншых* — інтэлектуалы, бізнэсоўцы, згодныя весьці бізнэс *as usual* з усімі тымі, хто кіруецца ўнівэрсальнымі прынцыпамі справаводзтва, а таксама антраполягі, якія вывучаюць чалавечыя паводзіны. Пржавальскі, Марка Пола, Лівінгстан, Кук у свае часы зьдзейсьнілі адкрыцьці ў Манголіі, Кітаі, Афрыцы, якія потым прывялі туды забойцаў. Ваякі Пісара ды Картэса не адносіліся да аніводнай з тых катэгорыяў. Цывілізацыя мая, слабейшая ня толькі праз адсутнасьць агняпальнае зброі, але і праз інтэлектуалізаванасьць, была зьнішчаная праз дзікуноў. Розгалас тых падзей замацаваўся ў кнігах аб «перамозе хрысьціянскага місіянэрства над паганствам» дый дасюль апаноўвае думкі шмат каго.

Людзям уласьціва выпінацца. Эліта можа дазволіць сабе раскошу ставіцца да астатніх як да роўных, бо тыя напраўду ёсьць роўнымі біялягічна, далейшыя адрозьненьні вызначае менавіта грамадзтва. Астатнія, масы, ня могуць, бо іх шмат і ім трэба біцца за вызначэньне сябе ў невялічкім коле сабе падобных. Гэтая бойка пачынаецца з таго, у каго лепшы мабільнік, і сканчаецца тым, у каго лепшыя шпалеры. Даруйце. А калі праблемы невырашальныя, то іх карані заўжды шукаюцца ў іншым. Такім чынам і ствараецца міт аб эмігрантах, а праз эмігрантаў гэтая прымха распаўсюджваецца на ўвесь народ. Бо хто з тых, хто лае Грузію, сапраўды быў там? Хто з тых, хто аблівае туркаў у Нямеччыне брудам, сапраўды вандраваў далей за эўрапейскі Стамбул? Хто ведае гісторыю Стамбулу, акрамя таго, што «яны» «панішчылі там усе нашыя храмы»? Толькі інтэлектуалы.

У свой час Мальтус пісаў, што войны — гэта добра, бо яны скарачаюць насельніцтва, якое б'ецца за абмежаваныя рэсурсы. Ён памыляўся ў гэтым. Але ў мяне ўражаньне, што якасьць мазгоў у сьвеце зьмяншаецца. Улічваючы тое, што нацыяналісты ўсіх чыноў усё мацней уздымаюцца над сьветам.

На жаль, чыгункі ды камунікацыі прыйшлі занадта хутка ў наш сьвет.

## It's the highway to hell…

Алекс ван Ліндштотэн — другі пасьля Ніраджа касмапаліт, які проста закахаўся ў Кандагар. Абодва не амэрыканцы і не брытанцы. Нірадж — індус, Алекс — галяндзец, але ў перамовах яны аддаюць выключную перавагу ангельскай мове. Абодва маюць досыць аргумэнтаў пра тое, якія іхныя родныя краіны непаўнавартыя (Індыя — у сваім разьвіцьці, Нідэрлянды — праз свой імпэрскі комплекс ды замкнёнасьць).

Алекс вандраваў да Кандагару ў адзіноце, на звычайным аўтобусе. З аўганцамі. Гасьцінец той вельмі непрыемны, талібы кантралююць фактычна ўсе сталіцы правінцыяў ды паветаў, таму ехаць небясьпечна. Замежнік тут — добры тавар для гандлю. Захапіў ды чакаеш на выкуп. Двух выкрадзеных італьянцаў выкупілі. Індыйскага інжынэра, будаўніка дарог, празь дзень пасьля выкраданьня знайшлі зарэзаным на дарозе. Камунікаты талібаў голасна заявілі, што яны — «людзі гонару і не забіваюць закладнікаў, за якіх ужо запыталі выкуп». Віну тады звалілі на пакістанцаў. Сапраўды, мяжы там не існуе, але звальваць правіны на пакістанцаў ператварылася ў звычку. Пры гэтым існуе такая падвойнасьць — маўляў, мы супраць пакістанскага ўраду, а з народам у нас добрыя дачыненьні, але падчас знаёмства найперш выпытваюць у чалавека ягоную нацыянальнасьць.

Аўтобус спынілі на КПП, талібы выцягнулі Алекса і першым чынам задалі пытаньне, чаму не размаўляе па-пуштунску. Той адказаў нешта на арабскай мове. Мабыць, гэта яго й выратавала, таму што арабаў там няшмат, неадукаваныя аўганцы дасюль лічаць арабаў вышэйшаю нацыяй, бо на той мове быў напісаны Каран, і таму прапусьцілі яго. Гукі мовы яны пазналі.

Звычайная тактыка: на прыдарожным базары стаіць назіральнік ды сочыць, ці праедзе хто варты ўвагі. Калі так — адразу ж паведамляе сваім «калегам», што чакаюць далей, і тыя рыхтуюцца да захопу машыны. Звычайна гэта адбываецца на блёкпосьце. Талібы нярэдка пераапранаюцца ў форму паліцыі, каб не выклікаць падазрэньняў.

Прыходзіцца вандраваць на звычайнай «Кароле», без аніякіх пазнакаў на ёй, у традыцыйнай вопратцы. І падвучваць арабскую мову.

## Транссавецкі аўтаспын

Першая ды пакуль што апошняя мая вандроўка з Масковіі да Ташкенту адбывалася без аніякіх прыгод. Адзінае непрыемнае здарэньне — разборка на казахска-ўзбэцкай мяжы. Нядаўна, дарэчы, вычытаў, што Расея ды Казахстан ня вельмі адстаюць ад ЗША па колькасьці мігрантаў. ЗША на першым месцы па колькасьці мігрантаў, што прыяжджаюць штогод, Расея — на другім, а Казахстан — на чацьвертым. Узбэкі пряжджаюць працаваць на здабычы газу ў Атыраў, Актаў, на будаўніцтва Астаны ды Алматы. У Казахстане стаўленьне да тых узбэкаў прыблізна тое ж самае, што і расейцаў да «чурак».

Жанчына, што падвозіла мяне, папярэдзіла: калі што, адразу ўздымай гвалт. Пад'ехалі да КПП, увогуле нічога такога на пашпартным ці мытным кантролі не адбылося, толькі кіраўнік зьмены пацікавіўся маім пашпартам — ніколі там беларусаў не праязджала. Тут падыходзіць нейкі спарахнелы таварыш, флэшыць у вочы нейкую «корачку» і просіць мой пашпарт. Я спытаў яго ветліва, маўляў, дайце, калі ласка, вашыя паперы. Мне ў адказ:

— Убери руку, а то сломаю.

Я, шчыра кажучы, спачатку не зразумеў. Лыпаў на яго вачыма сэкунд пяць, ня ўцямліваючы, як можна так размаўляць.

— Кліч кіраўніка зьмены.

— Убери руку, а то сломаю. Говори по-нормальному, узбек чёртов.

Праз мой хамэлеонаў твар я паўсюль — у Пакістане, Аўгане, Іране — мяне пры-

малі за свайго. А тут мяне палічылі ўзбэкам. Нафта хлопцам у галаву грукнула.

Я дэманстрацыйна зрабіў выгляд, нібы званю консулу. Падбег кіраўнік зьмены, усе кіроўцы пачалі ўслухоўвацца ў нашу размову. Ад такой паблісіці той кадар схаваўся. Мая шофэрка патлумачыла, што яны звычайна хапаюць пашпарты і аддаюць іх потым толькі за выкуп. Карацей, дарваліся намады да ўлады.

На ўзбэцкім баку мытнік запрасіў мяне ў асобнае купэ і там сьпісаў пашпартныя зьвесткі. Мо меркаваў, што замежнік, які замест летака абірае аўтаспын, мае што хаваць. Але ж — не. Пра неабходнасьць рэгістрацыі, зразумела, ніхто не папярэдзіў. Але гэта й не было патрэбна.

Любоў «былых» да Беларусі — гэта ўвогуле асобная тэма. Усе, з кім я сустракаўся, проста рассыпаліся ў сваёй любові да Беларусі. Тыя, што дапамаглі мне знайсьці вакзал, адкуль ішлі прыватныя таксоўкі да Тэрмэзу, апошняга гораду на ўзбэцкім баку, паведамілі, што служылі ў свой час у Мачулішчах.

М-да. Калі я разьлічваўся з таксоўшчыкам, у вачах зьяўлялася невымыўная хцівасьць — ён тройчы пералічыў грошы. Але ж шмат хто хутка кідаў грошы пад накрыўку, не пералічваючы іх. Звычайна таксоўшчыкі нават казалі, «колькі дасі — тое добра». А тыя, хто больш за ўсё сіліўся выказаць сваю любоў да Беларусі, — звычайна былі з тае пароды, каму далей проста не было куды падацца. Памятаю, еду аднойчы з Баку, хлапец, што вёз мяне, разважае сам з сабою:

— Вот поеду я в Беларусь, прямо как домой к себе поеду. Кстати, я когда у вас жил, по-белорусски умел говорить. Такой смешной язык, поковерканный русский.

Я тады адразу спытаўся яго, дзе ён так вывучыў турэцкую (азэрская ды турэцкая вельмі блізкія адна да адной. Як яго гэта абурыла!).

У машыне на Тэрмэз апынуўся з трыма дзяўчатамі. Адна зь іх размаўляла па-расейску, доктарка. Прыгожая. Сама з Таджыкістану, казала, што зарабляе пад Тэрмэзам мо 50 000 сомаў — каля трыццаці эўра — штомесяц. Астатнія па-расейску не гаварылі.

Мне ня раілі вандраваць тутака. З таго часу, як скончылася вайна паміж Узбэкістанам ды Таджыкістанам, — чарговае наступства сталінскае палітыкі «падзяляй ды пануй», паўсюль зьнявечаныя небаракі, просяць міласьціну.

Вось хто сапраўды страціў амаль усё пасьля разбурэньня Саюзу, дык гэта тыя чатыры сярэднеазіяцкія краіны. Акрамя Казахстану. Пазбаўленыя ўсяго (толькі ў Туркмэністане была нафта), яны да апошняга трымаліся СССР. Белавескія пагадненьні былі ратыфікаваныя расейскім парлямэнтам 17 сьнежня, а юрыдычна СССР праіснаваў яшчэ да 21-га, да апошняй сэсіі парлямэнту Саюзу, які правялі гэтыя чатыры краіны. *Sapienti sat*.

На аўганскім баку я ўзяў таксоўку за 70 даляраў на ўвесь шлях да Кабулу. Па дарозе, праўда, падселі паліцыянты (калі паліцыі трэба кудысьці дакаціць — яны проста спыняюць першую машыну і без пытаньняў у яе залазяць). Падсеў яшчэ адзін стары — але ў Аўганістане стаўленьне да старых вельмі пачцівае, таму яму ніхто не замінаў.

Звычайная, дарэчы, практыка — падысьці да паліцэйскае станцыі і папрасіць спыніць машыну. Паліцыянт будзе спыняць нават вайсковыя канвоі.

Аднойчы праехаў у армейскай машыне. Весела, але мовы я ня ведаў, і яны ўвесь час сьмяяліся. Калі аўганцам нешта падабаецца ці нешта проста выходзіць па-за межы разуменьня — яны сьмяюцца.

Але паліцыянтаў шукаць ня трэба — аўганцы ў душы самі аўтаспыншчыкі. Толькі трэба ўмець таргавацца. І не саромецца пачынаць гандаль зь вельмі нізкае цаны. Аўганскі суразмоўца зробіць выгляд, нібы гэта яго страшэнна пакрыўдзіла, але яны не крыўдуюць. Калі ён можа загінаць завысокія цэны, то чаму я не магу даваць занізкія? Увогуле, таргаваньне мусіць прыносіць задавальненьне абодвум бакам.



**Заканчэньне будзе.**

# Пакаленьне вечных практыкантаў

Заніжэньне свайго багацьця зноў у модзе ў сацыяльнай гульні, дзе ідзе барацьба за прызнаньне і сэксапіл. Кампутарная рэвалюцыя цяпер дазволіла весьці інтэлігенцкае жыцьцё і бяз сталай працы. Таксама лічыцца прывабным нейкі час жыць ніжэй за свой матэрыяльны статус, затое належаць да асяродку людзей культуры, мастацтва ці мэдыяў.

Тыя, хто належыць да «пакаленьня практыкантаў» у Нямеччыне, адбываюць незьлічоныя практыкі і стажыроўкі, дарэмна скардзяцца на эксплюатацыю і тужліва чакаюць на працу сваёй мары. Шмат хто зь іх можа сабе гэта дазволіць — урэшце, яны жывуць за кошт сваіх бацькоў. Бо пакаленьне практыкантаў — гэта таксама і пакаленьне спадкаемцаў.

У апошні час усё больш актуальнай тэмай у Нямеччыне зьяўляецца спадчына. Маладыя людзі неахвотна кажуць пра грошы, што маюць ад бацькоў. Колькі дзён таму мне давялося пагутарыць з Андрэасам з Кёльну. Андрэас вывучаў гісторыю мастацтва — з захапленьнем, але задоўга. Пасьля ён быў заняты напісаньнем доктарскай працы, жывучы з розных часовых заробкаў. У крызісных сытуацыях заўсёды мог разьлічваць на бацькоў. Цяпер яму 31, і ён шукае працу. У яго ўжо нават ёсьць пэўныя ўяўленьні на гэты конт: можна было б працаваць у мэдыях ці ў музэі, дзе ён праходзіў слаўную практыку на пасадзе асыстэнта выставы. Ці, можа, выбраць унівэрсытэцкую кар'еру? Ну калі і так, то толькі за мяжой. «Жыцьцё — гэта мора магчымасьцяў, — кажа ён з энтузіязмам. — У найгоршым выпадку зноў пайду куды-небудзь на практыку».

Адкуль жа бярэцца такая бестурботнасьць? Сям'я Андрэаса належыць да тыповай сярэдняй клясы: яхты, што праўда, ня маюць, аднак жывецца ім заможна. Ці атрымае Андрэас у спадчыну іх маёмасьць? Ці ягоныя бацькі таксама атрымалі ў спадчыну маёмасьць сваіх бацькоў?

Паводле словаў Андрэаса, бацькі атрымалі ў спадчыну ад дзеда, які працаваў пасьля вайны стэльмахам, прадпрыемства, што спачатку здавалася ў арэнду, а пасьля было прададзена. На пытаньне, колькі яны за яго атрымалі, Андрэас з дакорам кажа: «Пра гэта размовы не вядзецца». Зрэшты, у ягонай сям'і ўвогуле не размаўляюць пра грошы. Ён сам ня можа ацаніць маёмасьці сваіх бацькоў.

## Два заробкі: з працы і ад бацькоў

27-гадовы Штэфан Орт спачатку вывучаў англістыку ў Вупэрталі, пасьля журналістыку ў Аўстраліі. Падчас вучобы ён пісаў артыкулы ў мясцовыя газэты. Калі вярнуўся з Аўстраліі з замежным досьведам, веданьнем замежных моваў і двума дыплёмамі магістра, пачаў шукаць стажыроўку. «Папраўдзе, я ўжо раней разумеў, што мяне ня возьмуць», — кажа ён. Цяпер ён адбывае практыку ў «Forum Online», за што атрымлівае штомесяц 350 эўра. Без дапамогі бацькоў Стэфан ня здолеў бы забясьпечыць сябе. «Мой бацька працуе выкладчыкам і ведае сытуацыю з працай для студэнтаў, — кажа Стэфан. — Ён не тэлефануе мне штотыдзень і не пытаецца, чаму я яшчэ не зарабляю». Стэфан ведае, як яму пашчасьціла зь ягонай адносна забясьпечанай сям'ёй. І ўсьведамляе, што пакаленьне практыкантаў здолее пражыць гэтак доўга, як доўга іх бацькі будуць пераказваць грошы ім на рахункі.

«Таксама і працадаўцы зыходзяць з таго, што выпускнікі ВНУ паходзяць з добра забясьпечаных сем'яў», — кажа 27-гадовая Вэрэна Шарштайн. Нядаўна яна атрымала дыплём музыказнаўцы і хацела працаваць музычным драматургам на прэстыжным музычным фэстывалі. Ёй прапанавалі працу на дзевяць месяцаў з заробкам у 800 эўра «бруднымі».

Калі яна запыталася ў свайго шэфа, як ёй пражыць на гэтыя грошы, у адказ пачула: «А гэта Вы павінны абгаварыць з бацькамі». Тыя ж, канечне, былі гатовыя дапамагаць дачцэ. Нягледзячы на гэта, Вэрэна хацела дамагчыся вышэйшага заробку. Хутка яна атрымала адмоўны адказ разам з абгрунтаваньнем, што яна, відаць, недастаткова матываваная да гэтай працы. Таму цяпер яна шукае далей.

Падчас сустрэчы з Аннай мы таксама размаўлялі пра грошы. Цалкам няблага атрымалася. Відаць таму, што лягчэй размаўляць пра грошы, калі іх няма. Анна ня хоча называць свайго прозьвішча. Яна распавядае пра нядаўняе сьвяткаваньне ў пабе: адзін зь яе сяброў атрымаў сталую працу на паўстаўкі ў бэрлінскай PR-агенцыі. Толькі герой вечару асабліва ня радаваўся. Як падсумаваў адзін з прысутных на вечарынцы, гэта быў адзіны чалавек за сталом, які мае сталую працу. Чацьвёра астатніх зь цяжкасьцю жывуць ад замовы да замовы. Незалежны журналіст змагаецца за напісаньне чарговага артыкулу, тэатральны харэограф чакае на новую п'есу, дзьве астатнія асобы адбываюць практыку — менавіта так выглядае тыповае жыцьцё выпускнікоў ВНУ — між практыкамі, замовамі і дамовамі на акрэсьлены час. Апроч таго, на другім пляне яшчэ ёсьць бацькі, якія выступаюць у якасьці страхаваньня ад рызыкі страты працы.

## Прэстыжная практыка лепшая за абы-якую працу

У Нямеччыне ў надта цяжкой сытуацыі знаходзяцца ня тыя, хто залічвае сябе да пакаленьня практыкантаў, а тыя, хто ня можа сабе дазволіць раскошы да яго належыць.

Напрыклад, Анна зь Ляйпцыгу, бацькі якой не былі ў стане фінансаваць зацягнуты пэрыяд жыцьця дачкі паміж заканчэньнем вучобы ва ўнівэрсытэце і пачаткам працоўнай дзейнасьці. Пасьля вучобы па спэцыяльнасьці «мэдыязнаўства» яна працуе ў цэнтры апрацоўкі тэлефанаваньняў. «Толькі гэта і застаецца, калі ты ня можаш дазволіць сабе праходзіць практыку», — кажа яна. Без усялякай злосьці яна гаворыць пра тое, што нехта ж павінен браць адказнасьць за ўтрыманьне ейных аднагодкаў. «Пакаленьню практыкантаў таксама патрэбныя грошы на вопратку, кампутар і піва», — кажа яна.

Практыка ёсьць і заўсёды была пэрыядам аптымізацыі, што служыць для дасягненьня прафэсійнай мэты. У цяперашні час на шляху да пачатку прафэсійнага жыцьця моладзь, аднак, не займаецца абы-чым. На імпрэзах дваццаціпяці- і трыццацігадовых можна часта пачуць: «Цяпер толькі праходжу практыку».



Як высьвятляецца — чарговую. Маладыя немцы наважваюцца на практыку ня дзеля таго, каб пазьбегнуць беспрацоўя, што пагражае ім. Проста больш прэстыжна прайсьці стажыроўку ў вядомым выдавецтве «Suhrkamp», чым атрымаць сталую працу ў спэцыялізаваным выдавецтве ў Штутгарце, што выдае кніжкі на тэму дашкольнай пэдагогікі. Праца ў апошнім пазбаўленая бляску. Цытуючы сацыёляга П'ера Бурд'ё, пра гэтыя «тонкія розьніцы» ў спосабе мысьленьня ўжо доўгі час сыгналізуе не гадзіньнік «Ролекс», а пастава і стыль жыцьця, што ўжо не вызначаюцца выстаўленьнем напаказ свайго багацьця».

Сёньня можна паходзіць з заможнай сям'і і, нягледзячы на гэта, жыць па студэнцкіх кватэрах ці запісацца на другі кірунак навучаньня, дзякуючы чаму можна танна езьдзіць на гарадзкім транспарце. Заніжэньне вартасьці свайго багацьця сёньня ёсьць адным з элемэнтаў сацыяльнай ролевай гульні, дзе ідзе барацьба за прызнаньне і сэксапіл. Асабліва вытанчанай формай какецтва пры гэтым ёсьць сэнтымэнтальнасьць і плаксівасьць.

## Адукаваныя зь вялікімі чаканьнямі

Пакаленьне практыкантаў само спрычыняецца да свайго стану балючай няпэўнасьці. У пэўны момант зьяўляецца прадчуваньне, што і дзясятая практыка не прывядзе да атрыманьня жаданай сталай працы ў прэстыжнай фірме і што, можа, большы б сэнс мела якая-небудзь менш захапляльная, але праца. Аднак практыкантам няма падставаў так баяцца беспрацоўя, як дзецям зь іншых сацыяльных праслоек: за апошнія 30 год ніводнага разу колькасьць беспрацоўных выпускнікоў ВНУ не перавысіла 5 %. Апошнім разам гэты паказчык склаў 3,8 %. За той самы час з прычыны эканамічнага крызісу беспрацоўе сярод асобаў без прафэсійнага дыплёму ўзрасло ў чатыры разы. Калі ж неспрыяльная сытуацыя на рынку працы ў вялікай ступені закранула б і выпускнікоў ВНУ, то і ў такім выпадку яны б мелі найлепшыя ўмовы для таго, каб падрыхтавацца да такога кшталту сацыяльных зьменаў. Як пішуць Голм Фрыбэ і Саша Лоба ў сваёй кніжцы «Wir nennen es Arbeit» («Мы называем гэта працай»), калі зьмяншаюцца шанцы на атрыманьне сталай працы, на дапамогу прыходзіць лічбавая рэвалюцыя, што дае магчымасьць весьці «інтэлігенцкае жыцьцё бяз сталай працы».

Пакаленьне практыкантаў, аднак, ня толькі вельмі добра адукаванае (вучоба за мяжой, веданьне замежных моваў, практыкі), але і мае большыя жыцьцёвыя чаканьні, чым усе папярэднія пакаленьні. Аднак гэтыя чаканьні не зьвязаныя з капіталістычным імкненьнем да прыбытку, а перадусім зь імкненьнем да самарэалізацыі і ўнутранай сьпеласьці. Іх дэвіз: ніякай нуднай офіснай працы, ніякай працы ў цэнтрах апрацоўкі тэлефанаваньняў — нават часова. На думку пакаленьня практыкантаў, нашмат больш прывабна нейкі час жыць ніжэй за свой матэрыяльны статус, затое належаць да асяродку людзей культуры, мастацтва ці мэдыяў.

Безумоўна, пакаленьню практыкантаў недаспадобы быць на ўтрыманьні бацькоў, якія сваёй грашовай дапамогай падаўжаюць час маладосьці сваіх дзяцей. Аднак іх слушна называюць прагматыкамі і безыдэйнымі. Яны ведаюць, што ім ніколі не наэканоміць гэтулькі, колькі яны атрымаюць у спадчыну. Бацькі і дзеці сваёй цеплыняй, любоўю і клапатлівай увагай ахвотна маскуюць той факт, што згода, якая пануе між імі, мае таксама і эканамічныя прычыны.

## Спадчына не для дзяцей

Існавалі пакаленьні, што лепш сабе ўсьведамлялі гэтую залежнасьць. З пакаленьня'68 у выніку нават выйшлі актывісты. Спэцыяльны прадстаўнік ААН у Афганістане Том Кёнігс у 1973 г. падараваў атрыманую частку спадчыны Народнаму Фронту Вызваленьня Паўднёвага Віетнаму, а таксама змагарам чылійскага руху супраціву. Пра гэтае радыкальнае адмаўленьне ад багацьця бацькоў сёньня нагадвае рух «Attac», што аб'ядноўвае групу маладых спадкаемцаў, якія прызначаюць частку сваіх грошай на фінансаваньне праектаў праціўнікаў глябалізацыі, складаючы гэтым самым пераважную меншасьць. Парадаксальным чынам іхны прыклад да перайманьня — Эндру Карнэгі — жыў у ЗША. Напрыканцы XIX ст. ён быў адным з найбагацейшых людзей таго часу. Карнэгі падараваў звыш 350 млн. даляраў грамадзка карысным арганізацыям, упарта падаючы толькі адно абгрунтаваньне свайго рашэньня: «Досьвед вучыць, што абцяжарваньне дзяцей спадчынай не прыносіць ім нічога добрага». На ягоную думку, гэта паслабляе іх волю да дзеяньняў. У такім самым духу дзейнічаюць два найбагацейшыя людзі сьвету — Ўорэн Бафэт і Біл Гейтс. Яны публічна заявілі, што пераважную частку сваіх грошай пакінуць у спадчыну дабрачынным арганізацыям, а не сваім дзецям.

«Грамадзкая няроўнасьць у Нямеччыне ўзьнікае ня толькі з прычыны розьніцы заробкаў, але таксама — і ўсё часьцей — у выніку атрыманьня спадчыны», — кажа сацыёляг Енс Бэкерт, які выконвае функцыю дырэктара Інстытуту грамадзкіх дасьледаваньняў імя Макса Плянка (Max-Planck-Institut für Gesellschaftsforschung) у Кёльне. Нямецкае грамадзтва доўгі час дбала пра празрыстасьць розьніцы ў заробках. Нізкі падатак ад спадчыны ў параўнаньні зь іншымі дзяржавамі сьвету сёньня ў сваю чаргу ёсьць выразам дбаньня пра няроўны падзел дабрабыту.

Спадчына да 250 тыс. эўра не абкладаецца падаткамі, у выпадку вышэйшых сумаў неабходна заплаціць падатак ад спадчыны ў памеры 7 — 17 % ад ейнай вартасьці ў залежнасьці ад падатковай клясы. У ЗША стаўка параўнальнага падатку складае амаль 30 адсоткаў вартасьці спадчыны.

## Спадчына — шчасьце ці пакута?

Падчас маёй трэцяй гутаркі з Андрэасам ён нарэшце наважыўся закрануць пытаньне грошай. Ён лічыць, што нават калі ягоная сям'я іх мае, дык і так яны яму нічога не прыносяць. Гэта самае датычыць спадчыны. Тое, што нехта паходзіць з добра забясьпечанай сям'і, неабавязкова значыць, што ён здольны надаць сэнс свайму жыцьцю. Гэтае ўменьне нельга атрымаць у спадчыну. Аднак спадчына дапамагае прафінансаваць каштоўны пэрыяд арыентацыі, якога часам патрабуе ад пакаленьня практыкантаў ужо зусім непразрысты прафэсійны сьвет.

**Вольга Данішэвіч, паводле gazeta.pl**

КРЫТЫЧНЫ НАСТРОЙ

ПАВАЛ АБРАМОВІЧ

# «…і разам ім не сысьціся»?

Апошнім часам беларускіх літаратараў, якія вядуць «жывыя дзёньнікі» (livejournal.com), значна паболела.

Ва ўмовах, калі правядзеньне літаратурных імпрэзаў у нашай краіне зрабілася праблематычным дзеля ціску ўладаў, Інтэрнэт па сутнасьці становіцца адзіным месцам, дзе беларускі пісьменьнік можа, не азіраючыся на дзьверы, спакойна пагутарыць з чытачом. Да таго ж, «жывыя дзёньнікі» даюць літаратару магчымасьць гаварыць з чытачамі *колькі заўгодна і калі заўгодна*, калі непасрэдны выступ перад аўдыторыяй ці сустрэча зь ёю, так бы мовіць, у часопісна-газэтнай прасторы маюць пачатак і канец. (У свой час Максім Багдановіч вельмі шкадаваў, што дзеля абмежаваньня газэтнай плошчы ў «Нашай Ніве» нельга друкаваць артыкулаў памерам больш за 5—6 старонак). Ня будзем забывацца таксама, што «жывыя дзёньнікі» пісьменьнікаў могуць рэдагаваць толькі яны самі, і поўная адсутнасьць дыктату рэдактараў, выдаўцоў і літаратурных крытыкаў у Інтэрнэт-прасторы некаторым творцам мастацкіх каштоўнасьцяў прыйшлася даспадобы. Дый і чытачы ад з’яўленьня пісьменьніцкіх «жывых дзёньнікаў», здаецца, толькі выйгралі: цяпер яны маюць унікальны шанец зазірнуць у творчую лябараторыю літаратараў, даведацца, над чым яны працуюць, пакінуць свой водгук ці паведамленьне. І нават абмеркаваць са самімі пісьменьнікамі дэталі іх прыватнага жыцьця. Прыкладам, параіць Югасі Калядзе (http://magdalena-jojo.livejournal.com), якія беларускія прадукты харчаваньня лепш ніколі не набываць; напісаць Адаму Глёбусу (http://adam-hlobus.livejournal.com), хто лепш атрымаўся на здымку — ён сам ці ягоная жонка; падказаць Аксане Бязьлепкінай (http://bezlepkina.livejournal.com) каардынаты дзіцячага нэўроляга альбо даведацца, ці ачуняла яна нарэшце пасьля грыпу.

Аднак у чытацка-пісьменьніцкім асяродзьдзі Беларусі нямала і тых, хто лічыць, што людзі, якія ствараюць і чытаюць «жывыя дзёньнікі», імкнуцца толькі нагадаць пра сябе, выпхнуцца на «пярэдні плян». Няма, кажуць яны, у тых блогах шчырасьці, а толькі «откровения», глупствы, балбатня, лаянка. І адзначаюць, што карыстальнікі livejournal.com нагадваюць ім удзельнікаў reality-шоў, якія дазваляюцьназіраць за сабой кожнаму ахвотнаму і імкнуцца любымі сродкамі ва ўсім пераўзысьці астатніх гульцоў. Дарэчы, некаторыя пісьменьнікі — сталыя аўтары «жывых дзёньнікаў» — ускосна пацьвярджаюць гэтыя словы, раз-пораз дэманструючы сваю стому ад штодзённага знаходжаньня ў віртуальнай прасторы поруч з натоўпам графаманаў ды вычварэнцаў і міжволі прыходзячы да высновы, што літаратура і «віртуальныя» дзёньнікі — *несумяшчальныя*. Ямчэй за ўсіх гэтую думку выказаў Уладзімер Сьцяпан (http://ul-sciapan.livejournal.com): «Інтэрнэтаўскія тэксты двойчы не чытаюць» (пост ад 19.02.2007).

А як мяркуеце вы?

ВЯСКОВЫ ЛІРНІК

# Заазер’е. Крыжы з нашае памяці

Мой інтарэс — старадаўнія могілкі. Дзе б я ні быў, імкнуся заўжды наведаць найперш іх. Тут мяне цікавіць усё: ад крыжоў, надмагільляў, агароджаў да сьціплых біяграфічных зьвестак.

Краязнаўца Міхась Карпечанка прапанаваў наведаць могілкі блізу дзьвюх бялыніцкіх вёсак: Заазер’я ды Карманоўкі. Клады ў Заазер’і надзвычай старыя. Старажылы ня памятаюць, калі на іх хавалі. Выгляд могілак пра тое кажа сам. Калі б не вялізны крыж, высечаны з каменя, яны б ужо даўно зьніклі ў лясных нетрах. Урэшце, і на яго ня кожны зьверне ўвагу. Ён стаў часткай лесу. Замшэлы, як і не стары яшчэ ельнік, ён упарта нясе сваю варту пры лясной дарозе.

Маладыя жыхары навакольных вёсак пры згадцы пра гэтыя могілкі сарамліва паціскаюць плячыма: ня ведаем. Нічога пэўнага ня могуць сказаць і старыя.

Міхась Карпечанка з усьмешкай пераказвае легенду. Нібыта крыж — напамін пра напалеонаўскага генерала, які загінуў, калі французкае войска ў 1813 годзе адыходзіла на захад. Наўрад ці гэта праўда.

Пасечаны часам крыж стаіць. Але яшчэ дзясятак гадоў — і ён абрынецца, зарасьце мохам, як і яго сьціплыя суседзі. У гэтым, відаць, і ёсьць прыродная справядлівасьць: на гэтым сьвеце вечнага няма.

На другіх могілках, блізу Карманоўкі, хаваюць. Спарахнелыя драўляныя крыжы суседзяць з каменнымі крыжамі ды надмагільнымі камянямі.

Міхась Карпечанка зьезьдзіў Бялыніцкі край уздоўж і ўпоперак. Ён кажа, што ў лясах, на балотных выспах каменных знакаў процьма. Не адзін калгасны плуг быў зламаны на курганах аб велізарныя камяні зь невядомымі надпісамі.

Спадар Карпечанка перакананы, што яны як гісторыка-культурная спадчына павінны скласьці музэйныя экспазыцыі. Справа за малым: тыя экспазыцыі арганізаваць.

**Алесь Асіпцоў, фота Аляксандра Ліціна**



## СЯРЖУК СЫС

ВЯРТАНЬНЕ ЗІМЫ

Белы горад сьвяткуе вяртаньне зімы
(з турмы!)
І сьпявае «Валькірыю» хор бэнзапіл
(з магіл!)
На канцэрце шмат галак і крумкачок
(маўчок!)
Захапляюцца Вагнэрам зь лёжы дрэў
(пся крэў!)
Дрэвы валяцца долу адно за адным
(у дым!)
А рабочыя іх раскрыжуюць да плах
(пах!)
А затым мёртвым друзам нагрузяць прычэп
(хлеб!)
Так зьнікае алея самотных таполь
(боль!)
Белы горад сьвяткуе вяртаньне зімы
(і мы!)

## АЛЕСЬ АРКУШ

***

марыць па–сапраўднаму
адзінае што нам застаецца
пра што — неістотна
бо марыць —
як мець надзею
на лепшае і сьветлае
і неістотна што сьвет
як дзіцячы калейдаскоп
пры кожным руху
укладае новы малюнак
з прастакутнікаў ромбікаў
трохкутнікаў і кружочкаў —
падставовых матэрыялаў
для любой сур’ёзнай справы

мара — гэта вочка калейдаскопу
глядзець у якое дазваляецца
у час гульні зь дзецьмі
у час сьвята нашага таямнічага
і ў свой апошні час

## ЮЗІК ДЗЕНІСЮК

ВЭРТЫКАЛЬНАЕ АХАЛАДЖЭНЬНЕ

Сьнежань — бязь сьнежнай бабы.
Газавы — Новы год,
Нафтавыя — Каляды,
Вадохрышча — без прыгод.

Назначаных дэпутатаў
Нарэшце ўперлі ў Савет.
У чаканьні росту зарплаты
Пакуль жуеш вінэгрэт.

У чаканьні падвышкі пэнсій
З надзеяй глядзіш БТ,
А там толькі танцы ды песьні —
Суцэльнае вар’ятэ.

А мы ж малявалі старанна
Птушачкі ў бюлетэнь.
Заўчасна лічылі «абраных» —
Крый Божа, на ўлады цень!

І што атрымалі за вернасьць?
Цэны на ўсё растуць…
А мы ж усю жызьню на фэрмах
Калгасу «Ленінскі пуць».

Падвышку, хазяін, зрабіце,
Каб страты кампэнсаваць,
Хацім «Зімалета» з «Крыніцай» —
Няёмка зацірку хлябаць.

**Паэты Ўладзімер Някляеў і Рыгор Сітніца.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Спачатку — у «ARCHE», потым — у глямуры

**«Любовь-морковь»**

Расея, 2006, каляровы, 95 хв.

**Рэжысэр:** Аляксандар Стрыжэнаў.

**Ролі выконваюць:** Крысьціна Арбакайтэ, Гоша Куцэнка, Міхаіл Казакоў, Вольга Арлова, Яўген Стычкін, Андрэй Краско, Кацярына Стрыжэнава, Станіслаў Дужнікаў.

**Жанр:** камэдыя сытуацый.

**Адзнака:** 4 (з 10).

Шлюб Андрэя і Марыны на мяжы развалу. Яны зьвяртаюцца да таямнічага лекара (Міхаіл Казакоў), які абяцае дапамагчы. Раніцай героі высьвятляюць, што абмяняліся целамі. Цяпер яны зразумеюць «гендэрныя асаблівасьці» адно аднаго...

Карціна магла быць створаная ў Беларусі. Драматург Андрэй Курэйчык колькі гадоў таму напісаў п'есу «Выканаўца жаданьняў», якая нат была надрукаваная ў часопісе «ARCHE». Але камэдыйны, апалітычны і вадэвільны сюжэт пра абмен целамі ня стаўся запатрабаваным у краіне (хаця брак добрых сцэнароў — сталы боль «Беларусьфільму»).

Андрэй Курэйчык знайшоў іншых замоўцаў. Ён ускладніў кароткую гісторыю дэтэктыўнай інтрыгай, дадаў жартаў, распрацаваў новыя пацешныя маскі (накшталт гангстэра, які «робіць жыцьцё» паводле галівудзкіх рэцэптаў).

Рэцэпты «Любові» — расейскія.

Прадусар стужкі Рэнат Даўляцьяраў прызнаўся: «Мы вырашылі зрабіць карціну глямурнейшай за п'есу». Рэжысэрам быў запрошаны Аляксандар Стрыжэнаў, чые «Ад 180 і вышэй» і «Ўпасьці ўверх» — узоры «гандлёва»-тандэтных стужак.

Ня Гоша Куцэнка з гістэрычнымі звычкамі малімоннай бляндынкі і не Крысьціна Арбакайтэ (з подзьвігамі пад «Нябесную кару») героі карціны. Галоўныя пэрсанажы — тавары: самыя дарагія дыскатэкі, статусная гарэлка, навараскія дэкарацыі — і нат Марк Шагал. Цела, жэсты, макіяж, патопленая машына дый само каханьне (калі было такое) — тавар для самых багатых (якія ў Расеі ўжо зьявіліся).

Чалавечыя гісторыі непаразуменьня, сьмешныя недарэчнасьці зьнішчыць глямурнаю рэжысурай цалкам не атрымалася.

Але атрымалася зрабіць колішні беларускі сюжэт цалкам чужым.

Фільм — ідэальнае відовішча для Паліны Смолавай.

**Андрэй Расінскі**

## ТЭАТРЫ

**Купалаўскі тэатар**

**9 (пт)** — «Кім».
**10 (сб)** — «Памінальная малітва».
**11 (ндз)** — «С.В.».
**16 (пт), 17 (сб)** — «Вольга».
**18 (ндз)** — «Каханьне ў стылі барока».
*ранішнія спэктаклі*
**11 (ндз)** — «Афрыка».
*малая сцэна*
**11 (ндз)** — «Апэльсынавае віно».
**14 (ср)** — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях».

**Опэра**

*на сцэне ЦДА*
**12 (пн)** — «Яўген Анегін».
**13 (аўт)** — «Турандот».
**15 (чц)** — «Джані Скікі».
**16 (пт)** — канцэрт «Жамчужыны барочнай музыкі», «Кававая кантата» – опэра ў адной дзеі.

**Тэатар беларускай драматургіі**

**11 (ндз)** — «Іванаў».
**13 (аўт)** — «Валянціна».
**14 (ср)** — «Містэр Розыгрыш».
**15 (чц)** — «Палёты з анёлам».
**15 (чц)** — «Белы анёл з чорнымі крыламі».
**16 (пт)** — «Адэль».
**16 (пт)** — «Рабаўнік».
**17 (сб), 18 (ндз)** — «Што за цуд гэтая казка».
**17 (сб), 18 (ндз)** — «Забойства па-француску».
**18 (ндз)** — «Адвечная песьня».

## КАНЦЭРТ

**Тры расейскія літары!!!**

**11 сакавіка** ў фальварку «Добрыя мысьлі» (вул.Магілёўская, 12) адбудзецца unplugged-прэзэнтацыя кліпа гурту «Zigzag» «Тры расейскія літары!!!», прысьвечаная антыглябалізму, барацьбе супраць мацюкоў, блатной культуры і «адвёрткі». Удзельнічаюць: гурт «Happy 3 Friends», Насьця Хмель («Джамбібум»), Ігар Гарбачэўскі («Kalahari»), Ксенія Мінчанка («WZ Orkiestra»), гурты «Logothere» (Аўстрыя-Нямеччына-Беларусь), «Мамкины бусы», «Zigzag». **Пачатак а 19-й.** Квіткі: 12 000 загадзя, 15 000 у дзень імпрэзы. Т.: 660-40-20, 224-64-86.






МАЛЮНКІ І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

**...праект «Лукашэнка-2008» не абмяжоўваўся Расеяй.**




**...бальшавік Міхаіл Фрунзэ ведаў, што створаная ім беларуская міліцыя будзе праз 90 гадоў перасьледаваць камуністаў.**

— Ну, што, таварыш Фрунзэ, можна цяпер зрабіць для перамогі камунізму? Можа, створым міліцыю?

— Ніякіх мянтоў! У імя нашых ідэйных нашчадкаў лепш пойдзем «папросім закурыць» у таго мінака.

**...міністры сапраўды перажывалі за лёс гаспадаркі**

— Як гэта разумець, спадар Кабякоў?! Вас злавілі з улёткамі, якія заклікаюць выйсьці 25 сакавіка на Плошчу!

— Ну, я думаў, калі зьбярэцца хеўра народу — абавязкова папрэ на праспэкт. Уявіце — з кожнага можна спагнаць па 30 тысячаў за парушэньне правілаў пераходу вуліцы! Гэта ж ніякіх расейскіх крэдытаў ня трэба будзе!



# пра-бел / пра-сьвет

Эсэістыка • Крытыка • Рэфлексіі

Ян Максімюк. Лукашэнку чакае змрочная будучыня .............. 19

Сяргей Богдан. ЗША супраць Ірану: вайна можа мець нечаканы вынік .......... 20

Янка Саламевіч. Мова беларускага радыё .............................. 22

Аляксей Лявончык. У пекле Азіі .............................. 24

Пакаленьне вечных практыкантаў .............................. 26

Павал Абрамовіч. «...і разам ім не сысьціся»? .............................. 28

Алесь Асіпцоў. Заазер'е. Крыжы з нашае памяці .............................. 28



## год паэзіі

Сяржук Сыс.
Вяртаньне зімы .............................. 29

Алесь Аркуш.
«марыць па-сапраўднаму...» .............. 29

Юзік Дзенісюк.
Вэртыкальнае ахаладжэньне .............. 29

## СПАЧУВАНЬНІ

**Шчырыя спачуваньні** Вінцуку Вячорку з прычыны сьмерці бацькі. Сьветлая памяць Рыгору Вячорку (1934—2007). Сябры

**Паплечнікі па партыі**, па грамадзкай дзейнасьці, сябры з Маладэчна выказваюць самыя шчырыя спачуваньні Вінцуку Вячорку і яго сям'і з прычыны напаткаўшага гора — сьмерці бацькі.

**На сайце nn.by разьмясьцілі свае спачуваньні** Лявон Баршчэўскі, Сяргей Дубавец і сям'я Дубаўцоў, Франак Клімковіч і сям'я Клімковічаў, Аляксандар Фядута, сям'я Сагановічаў, Міхал Трацэўскі, Янка Запруднік, Алесь Капуцкі, Канстанцін Міронаў, Якуб Лапатка, Уладзіслаў Вепржыцкі, Вінцэсь Мудроў.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

«Раніцаю ў дзень адкрыцьця Думы, ў дзень вялікага сьвята народнага – у Варшаве павесілі трох людзей...

А перад Таўрычаскім палацам, гдзе засядае Дума, народ сабраўся спатыкаць сваіх дэпутатаў, і з грудзей тысячаў людзей ляцеў у неба галасны крык: «амнэсьція! амнэсьція!..»

Год таму назад дэпутаты самы крычалі ў Думе: «амнэсьція! амнэсьція!» – але ж іх голас, іх трэбаваньне, іх просьба ня мела ніякой сілы; міністры іх не паслухалі. І цяпер выбарныя народныя ўжо нічога ня просяць: яны ведаюць, што гэта ўсё роўна не паможа».

**«Наша Ніва». №9. 1907.**




А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 17.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### КАНТАКТЫ

**Аляксандар Мілінкевіч!** Так трымаць!!! Другазаконьне, 1:21! Брат

### КНІГІ

**Прапаную кнігі:** Тарашкевіч «Беларуская граматыка», Нью-Ёрк, 1929, Гётэ «Фаўст», «Наша Ніва» 1906–1908 г, «Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі» 1–5 т, Кацар «Беларускі арнамэнт», «Беларуская вышыўка», Туронак «Беларусь пад нямецкай акупацыяй» ды іншае, багаты выбар. Т.: 753-70-05

### ПАДАРОЖЖА

**Зьміцер Касьпяровіч** запрашае ў падарожжа 18 сакавіка: Іўе—Суботнікі—Жамыслаў—Трабы—Гальшаны—Баруны—Крэва. Т.: 292-54-58, 622-57-20, 509-12-16, 110-19-28, 573-88-17

### ХОСТЫНГ

**http://belmov.org/host.html**. Мы забясьпечваем бясплатны і надзейны хостынг (падтрымлівае PhP, MySQL...), дамэн і аказваем тэхнічную дапамогу для беларускамоўных сайтаў. Нашымі паслугамі скарысталіся ўжо шмат праектаў, у тым ліку www.saligorsk.org, www.maladechna.org, www.pbpf.org , www.mensk.by... Калі ёсць неабходнасьць ў хостынгу, паведаміце нам, калі ласка, будзем рады дапамагчы

## ПАШТ. СКРЫНКА

**Сяргею Ц. зь Бегам'я.** Артыкул з Вашым бачаньнем веры ў Бога з Вашага дазволу перадамо ў адно з пратэстанцкіх выданьняў. Фармату сьвецкай «НН» ён не адпавядае.

**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2241. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 28.02.2007.

Замова № 1302.

Рэдакцыйны адрас: Калектарная, 20а-112.